WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ВЕРАСНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 175 (27039)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА КАТЭГАРЫЧНА СУПРАЦЬ ПЕРАНОСУ ТЭРМІНАЎ РЭАЛІЗАЦЫІ ІНВЕСТПРАЕКТА «МІНСК-СІЦІ» І ЗМЯНЕННЯ ЯГО КАНЦЭПЦЫІ

**Інвестпраект «Мінск-Сіці» павінен быць рэалізаваны ў тыя тэрміны і ў тым выглядзе, як гэта было зацверджана раней і ўзгоднена з кіраўніком дзяржавы. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 верасня на нарадзе, прысвечанай ходу рэалізацыі гэтага праекта.**

Асноўным падрадчыкам будаўніцтва выступае расійская кампанія ТАА «Ітэра Груп». «Прыцягненне замежнага капіталу ў беларускую эканоміку з'яўляецца для нас адным з прыярытэтных напрамкаў міжнароднага супрацоўніцтва», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, пры ўдзеле інвестараў у Беларусі выконваецца шэраг праграм, хоць іх колькасць недастатковая.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка выказаў незадаволенасць ходам рэалізацыі інвестпраекта «Мінск-Сіці». «Шчыра кажучы, ужо надта непрыстойна абмяркоўваць гэту праблему на ўзроўні Прэзідэнта. Яна ўзнікае не першы раз», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў 2008 годзе для ажыццяўлення праекта ў цэнтры сталіцы было выдзелена больш як 300 га. Прычым зямель вельмі каштоўных у плане горадабудаўніцтва. «Гэта асноўны інвестыцыйны праект нашай краіны», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён ацэньваецца ў $5,1 млрд.

«Знайшлі, здавалася б, сур'ёзнага інвестара. Выдалі пад яго некалькі спецыяльных указаў Прэзідэнта. Улічваючы пажаданні кампаніі, ужо некалькі разоў пераносілі тэрміны рэалізацыі і неадназначна прадстаўлялі розныя прэферэнцыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Горад, як мне дакладваюць, практычна поўнасцю ўзяў на сябе будаўніцтва сацыяльнай інфраструктуры. Іншымі словамі, былі створаны добрыя ўмовы для работы. На жаль, воз і цяпер там, да гэтага часу не вырашана пытанне вынасу за межы Мінска авіярамонтнага завода», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запатрабаваў растлумачыць той факт, што з 2009 года асвоена толькі 0,3 працэнта ад заяўленага аб'ёму інвестыцый. «Ці інвестар страціў інтарэс да праекта? Ці нежаданне мясцовай улады весці канструктыўны дыялог?», — задаў заканамерныя пытанні Прэзідэнт.

«Мне патрэбна сёння аб'ектыўная карціна сітуацыі. І патрэбна сумленная адкрытая размова. Гатовы будаваць — будуйце. Не — ёсць іншыя інвестары, трэба перадаваць гэты праект тым, хто сёння можа будаваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён папярэдзіў, што не трэба сёння весці нейкія дадатковыя размовы аб ільготах і прывілеях. Дзяржава і так дастаткова ішла на ўступкі інвестарам па гэтым праекце.

Як далажыў Прэзідэнту старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон, цяпер на выдзеленай тэрыторыі ў прэстыжным раёне сталіцы практычна нічога не будуецца, акрамя панэльных жылых дамоў тыпавых праектаў, якія ўзводзяцца за кошт сродкаў беларускіх дольшчыкаў. Нявызначанасць з вынасам аэрапорта і будаўніцтвам цэнтра тэхнічнага абслугоўвання і рамонту авіяцыйнай тэхнікі негатыўна ўплывае на паўнацэннае функцыянаванне як самога аэрапорта, так і авіярамонтнага завода. Можа ўзнікнуць пагроза страты каштоўных спецыялістаў.

Аляксандр Якабсон канстатаваў, што з боку інвестара адзначаецца непаслядоўнасць дзеянняў і невыкананне раней дасягнутых дамоўленасцей. Кампанія сёння заяўляе аб прыкметным зніжэнні эканамічнай прывабнасці інвестпраекта і немагчымасці яго рэалізацыі на першапачатковых умовах. Паводле слоў старшыні КДК, гэта не пацвярджаецца канкрэтнымі эканамічнымі разлікамі. Кампанія мае цяжкасці з прыцягненнем фінансавых сродкаў у «Мінск-Сіці», у той час як паспяхова рэалізуе праекты ў іншых дзяржавах пры агульным аб'ёме інвестыцый больш як $8 млрд.

У той жа час старшыня КДК звярнуў увагу на слабую каардынацыю і недастатковую актыўнасць адказных дзяржаўных органаў пры вырашэнні спрэчных пытанняў. «Саветам Міністраў не створаны штаб або іншы каардынуючы орган для кантролю за ходам рэалізацыі такога маштабнага для краіны праекта, што не дае магчымасці аператыўна вырашаць узнікаючыя пытанні», — адзначыў Аляксандр Якабсон. Ёсць факты чыноўніцкай валакіты.

Цяпер павінна ўжо быць функцыянаваць першая чарга цэнтра і весціся рэалізацыя чатырох этапаў дзелавога цэнтра — так задумалася першапачаткова.

Першым этапам праекта прадугледжвалася будаўніцтва 14 жылых дамоў, гандлёвага цэнтра, адміністрацыйнага будынка, трох паркінгаў. Пры гэтым толькі каля 3 працэнтаў сродкаў намячалася атрымаць ад кампаніі, у якасці асноўных фінансавых укладанняў вызначаны сродкі дольшчыкаў і крэдыты банкаў.

Як канстатаваў Аляксандр Якабсон, усе абставіны сведчаць, што інвестыцыйная стратэгія кампаніі «Ітэра» ў Беларусі накіравана на мінімізацыю ўласных затрат і максімальнае выкарыстанне мясцовых крыніц фінансавання з далейшым рэінвесціраваннем атрыманых даходаў у чарговыя этапы праекта. Пры гэтым інвестар не прымае мер па зніжэнні выдаткаў.

СТАР. 2

## Надзея Ермакова назначана кіраўніком ад Беларусі Міжнароднага валютнага фонду

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў старшыню Праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову кіраўніком ад Рэспублікі Беларусь Міжнароднага валютнага фонду.**

Адпаведны ўказ № 412 падпісаны ўчора.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзмітрыя Мядзведзева з днём нараджэння

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева з днём нараджэння.**

«Перакананы, што наша канструктыўнае супрацоўніцтва па шырокім спектры пытанняў будзе і надалей садзейнічаць рэалізацыі намечаных планаў па развіцці інтэграцыйных працэсаў у інтарэсах народаў Беларусі і Расіі», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама выказаў упэўненасць, што забеспячэнне высокага ўзроўню міждзяржаўнага дыялогу ў поўнай меры адпавядае інтарэсам Беларусі і Расіі — стратэгічных партнёраў і саюзнікаў.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Дзмітрыю Мядзведзеву моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у адказнай шматграннай дзейнасці ў імя Расіі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



### ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 224/С-13384, расположенного по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, площадь – 214,5 кв.м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование автостанция.** |
| Собственник (владелец) имущества | КУП БО «Бытовик» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Докшицы, ул. Ленинская, автостанция |
| Стоимость имущества | Лот № 1 – 159 384 000 белорусских рублей (с учетом НДС) |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Докшицы, ул. Ленинская, 24<br>05 октября 2011 года в 11.30 |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 304 http:// vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11<br>Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 04.10.2011.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



ISSN 1990 - 763X

## ПА КІМ ГУЧЫЦЬ ПАЛЯЎНІЧЫ РОГ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ансамбль паляўнічай музыкі з Драгічына «Бакас».

**СТАРЭЙШАЯ грамадская арганізацыя краіны — ГА «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» вырашыла адзначыць сваё 90-годдзе грандыёзным святам.**

Нягледзячы на тое, што ў разгары паляўнічы сезон, у Ратамку, якая знаходзіцца недалёка ад Мінска, з усіх куточкаў Беларусі прыехалі галоўныя спецыялісты — егеры і паляўніцтвазнаўцы, без якіх не можа адбывацца не толькі сапраўднае паляванне, але таксама немагчыма і паўнавартаснае аднаўленне папуляцыі паляўнічых відаў жывёл. 60 працэнтаў тэрыторыі, якая ў нашай краіне адведзена пад паляўнічыя мэты (палі, лясы, балоты) здадзена ў арэнду менавіта гэтай грамадскай арганізацыі. Як сапраўдная армія выглядалі калоны апранутых у аднолькавую форму людзей — вядома, камуфляжную і зялёнага колеру. Гэтае відовішча выклікала пачуццё павагі да нашых асноўных абаронцаў прыроды, нягледзячы на тое, што іх прафесія звязана з паляўнічай стрэльбай. Вядома, што на плечы гэтых людзей кладзецца і асноўны цяжар барацьбы з браканьерствам, якое, на жаль, яшчэ не выкаранена, як у іншых цывілізаваных краінах.

СТАР. 4

## АДНАРАЗОВУЮ ДАПАМОГУ БЮДЖЭТНІКАМ І ПЕНСІЯНЕРАМ ПЛАНУЕЦЦА АКАЗАЦЬ У ТРЭЦЯЙ ДЭКАДЗЕ ВЕРАСНЯ

**Аднаразовая матэрыяльная дапамога ў памеры Br500 тыс. бюджэтнікам і непрацуючым пенсіянерам, як плануецца, будзе выплачана ў трэцяй дэкадзе верасня, паведаміў БЕЛТА намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль ТОЗІК.**

Паводле яго слоў, праект адпаведнага ўказа перададзены ўрадам на разгляд Прэзідэнта. Гэты дакумент, падрыхтаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы, прадугледжвае выплату матэрыяльнай дапамогі работнікам бюджэтнай сферы, усім непрацуючым пенсіянерам, а таксама шэрагу катэгорый насельніцтва, якія па прапанове Прэзідэнта таксама неабходна падтрымаць. «Лічу, што гэтыя выплаты мы зможам зрабіць у трэцяй дэкадзе верасня», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Анатоль Тозік удакладніў, што прадугледжана аказанне матэрыяльнай падтрымкі ўсім непрацуючым пенсіянерам, незалежна ад велічыні іх пенсіі. Пры гэтым ён растлумачыў, што працуючым пенсіянерам поўную дапамогу павінны аказаць тыя прадпрыемствы, на якіх яны працуюць. «Можа, не ў такім памеры, але наколькі дае магчымасць эканамічны і фінансавы стан прадпрыемства. Ніводны чалавек не павінен застацца без падтрымкі», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

### У кіраўнікоў бюджэтных арганізацый дастаткова паўнамоцтваў для заахвочвання падначаленых

У кіраўнікоў бюджэтных арганізацый дастаткова паўнамоцтваў для матэрыяльнага і маральнага стымулявання работнікаў адэкватна іх укладу ў агульны вынік працы. Такі пункт гледжання выказаў Анатоль Тозік.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, гэта норма закладзена ў агульным выглядзе ў Дырэктыве № 4, яна рэалізавана ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у праграме дзейнасці ўрада. «Такім чынам, у Беларусі створана дастатковая нарматыўная база, каб кіраўнік мог заахвоціць супрацоўніка ў дакладнай адпаведнасці з яго ўкладам у выніки работы прадпрыемства», — растлумачыў віцэ-прэм'ер.

Пры гэтым ён удакладніў: «Калі хтосьці гаворыць, што такіх норм сёння недастаткова, то ён проста не ведае, што ёсць на самай справе».

«Сёння няма ніякіх стрымальных фактараў для заахвочвання людзей, якія ўносяць важкі ўклад у агульныя вынікі дзейнасці завода, фабрыкі, іншай арганізацыі. І гэтыя працаўнікі павінны адэкватна ацэньвацца як маральна, так і матэрыяльна. Яшчэ раз паўтараю: для гэтага ўся заканадаўчая база ў краіне створана. Проста некаторыя кіраўнікі не могуць адэкватна ацаніць уклад кожнага, або хочуць для ўсіх быць добрымі, — лічыць Анатоль Тозік. — Таму існуючыя магчымасці і фонды яны дзеляць на ўсіх. Так нельга, паколькі гэта крыўдзіць добрасумленных працаўнікоў і распускае тых, хто не хоча працаваць з поўнай аддачай. Гэта нядобрая тэндэнцыя. І мы павінны гэту псіхалогію неяк пераломліваць, што ўсім пароўну. Кожнаму — роўна столькі, колькі ён зрабіў».

## ІЛЬГОТУ НА БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД СТУДЭНТЫ АТРЫМАЛІ. ПРЫЧЫМ — УЖО

**12 верасня ў Мінгарвыканкаме прынялі рашэнне ўхваліць прадастаўленне студэнтам і навучэнцам дзённай формы навучання ўстаноў Мінска бясплатнага праезду з 1 кастрычніка, паведамілі ў прэс-службе сталічнай мэрыі.**

Такім чынам трохі заблытаная гісторыя з наданнем сталічным студэнтам права бясплатнага праезду ў гарадскім пасажырскім транспарце, пра якую мы пісалі ўчора (пра льготу абвясцілі, аднак на той момант словы не былі падмацаваныя ніякімі афіцыйнымі дакументамі), завяршылася: у іх з'явілася законная падстава для карыстання названай прэферэнцыяй. «У мэтах павышэння сацыяльнай падтрымкі навучэнцаў і студэнтаў... прынятае рашэнне ўхваліць прадастаўленне ў вызначаным парадку студэнтам і навучэнцам дзённай формы навучання ўстаноў горада Мінска, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдне-спецыяльнай і вышэйшай адукацыі бясплатнага праезду на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных гарадскіх зносін, гарадскім электрычным транспарце і метрапалітэне ў горадзе Мінску з 1 кастрычніка 2011 года. У бліжэйшы час гэтае пытанне будзе вынесена на разгляд Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў» — гаворыцца, у прыватнасці, на сайце Мінгарвыканкама.

Аднак, не чакаючы правядзення гэтай працэдуры, дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» для вышэйназванай катэгорыі нашых маладых грамадзян само ўвяло бясплатны праезд з 13 верасня. Каб скарыстацца льготай у гарадскім пасажырскім транспарце, паведамілі нам на прадпрыемстве, трэба паказаць кантралёру ці кандуктару арыгінал вучнёўскага ці студэнцкага білета. Да кандуктараў, каб не паўтараць памылак панядзелка (калі, так бы мовіць, студэнты патрабавалі, а кандуктары не маглі), даведзена патрэбная інфармацыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Перспектыўныя адкрыцці

## Я размаўляю па-беларуску з... камп'ютарам

**ВАМ не здалося, і тут няма памылкі друку: карэспандэнт «Звязды» сапраўды «пагутарыў» з камп'ютарам праз спецыяльную праграму, якая распазнае тэкставую інфармацыю і пераводзіць яе ў маўленне. Шмат для якіх моў такія праграмы ўжо існуюць. У нашай Акадэміі навук займаюцца распрацоўкай менавіта беларускамоўнага «гаваруна». Пра маўленчыя тэхналогіі расказала Лілія ЦЫРУЛЬНІК, кандыдат навук, выканаўца абавязкаў загадчыка лабараторыі распазнання і сінтэзу маўлення Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, і Юрась ГЕЦЭВІЧ, малодшы навуковы супрацоўнік той жа лабараторыі, які непасрэдна распрацоўвае беларускамоўны сегмент.**

***— Калі пачалася распрацоўка маўленчых тэхналогій?***

**Лілія Цырульнік:**

— Лабараторыя існуе больш за сорак гадоў. І ў той час, калі і камп'ютары былі не асабліва развітыя, і прайграванне маўлення было складаным нават з фізічнага пункту гледжання, лабараторыя пачала займацца маўленчымі тэхналогіямі. У прыватнасці, сістэмай распазнання маўлення і сістэмай сінтэзу маўлення, гэта значыць, пераводам інфармацыі з маўленчага віду ў тэкст і наадварот: з тэксту — у маўленчую форму. Дарэчы, вялікі ўклад у развіццё маўленчых тэхналогій у Беларусі ўнёс доктар навук Барыс Лабанаў, да нядаўняга часу — загадчык лабараторыі распазнання і сінтэзу маўлення, а зараз — галоўны навуковы супрацоўнік інстытута. За апошнія некалькі гадоў у лабараторыі распрацаваны сістэмы сінтэзу маўлення для рускай, польскай моў. Зараз распрацоўваецца сінтэзатар мовы для якуцкай мовы. Актыўна займаецца лабараторыя і распрацоўкай беларускамоўнага сінтэзатара маўлення.

***— Якое прымяненне можа быць у сінтэзатараў маўлення?***

**Лілія Цырульнік:**

— Прымяненне самае шырокае: стварэнне аўдыёкніг, дапамога сляпым людзям, чытанне электроннай пошты...

**Юрась Гецэвіч:**

— Электронныя чэргі таксама: можна вельмі гнутка і хутка змяняць выразы, якія «гаворыць» гэтая чарга.

**Лілія Цырульнік:**

— Яшчэ адно прызначэнне — захаванне выміраючых ці блізкіх да знікнення моў. Гэта таксама важна. Беларуская мова, праўда, такой не з'яўляецца, аднак у Чырвонай кнізе ЮНЕСКА яна залічана да групы нестабільных, якія патэнцыйна знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Да гэтай групы адносяцца мовы, якія не маюць ніякага афіцыйнага ці іншага статуса, ці мовы, што не карыстаюцца вялікім прэстыжам, ужыткам. Сістэма сінтэзу беларускага маўлення будзе спрыяць захаванню мовы.

СТАР. 2

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.09.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 5 347,00 | 1 чэшская крона | 295,90 |
| 1 еўра | 7 281,01 | 1 польскі злоты | 1 665,16 |
| 1 латвійскі лат | 10 244,28 | 1 расійскі рубель | 177,13 |
| 1 літоўскі літ | 2 104,50 | 1 украінская грыўня | 668,50 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,1872 |
| 10 UAH | 37,6869 |
| 10000 BYR | 56,4458 |
| EUR | 41,2267 |

### Аперацыя «гламурызацыя»

## «Міс Сусвет-2011»: час для Афрыкі

**ТЫТУЛ «Міс Сусвет» нарэшце пераедзе на іншы кантынент. Пасля трохгадовага дамінавання лацінаамерыканак новай «Міс Сусвет» прызнаная цёмнаскурая мадэль з Анголы Лейла Лопес.**

Шкада, што ў конкурсе «Міс Сусвет», які сёлета прайшоў у бразільскім Сан-Паўла, не ўдзельнічала Антарктыда. Інакш заключны раўнд конкурсу меў бы ўсе шанцы на тое, каб сабраць у фінале дзяўчат з усіх частак свету. У топ-5 конкурсу ў выніку ўвайшлі канкурсанткі з Анголы, Украіны, Філіпін, Кітая і Бразіліі. Усяго ж у спаборніцтве «прыгожых і незамужніх» прынялі ўдзел дзяўчаты з 88 (!) краін свету.

25-гадовая Лейла Лопес нарадзілася і вырасла ў Анголе. Размаўляе на партугальскай і англійскай мовах. Сёння дзяўчына вучыцца ў брытанскім універсітэце на менеджара. Яе рост — 1,79 см, гэта трэцяя перамога дзяўчыны ў конкурсах прыгажосці і першая — на конкурсе міжнароднага ўзроўню.

— Я не магу ў гэта паверыць! Мая мара збылася! — прызналася шчаслівая пераможца пасля таго, як атрымала карону.

Калі падчас інтэрв'ю ў яе спыталі, якія фізічныя якасці яна хацела б у сабе падкарэктаваць, дзяўчына адказала: «Зусім нічога. Я не хацела б змяняцца. Дзякуй Богу, я вельмі задаволеная тым, якой стварыў мяне Бог».

Беларусь, як вядома, у гэтым конкурсе пакуль не ўдзельнічае. Куды больш ахвотна мы рыхтуемся да ўдзелу ў конкурсе «Міс свету», дзе нашу краіну звычайна прадстаўляе «Міс Беларусь». Але сваю міс мы выбіраем раз на два гады, таму пытанне аб тым, хто з беларускіх дзяўчат паедзе на «Міс свету» сёлета, застаецца адкрытым.

**Ілья ЛАПАТО.**



## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ТЫСЯЧЫ ФАЛЬШЫВЫХ ДОЛАРАЎ ПРЫВЕЗЛІ З РАСІІ

**У Оршы міліцыянеры выявілі адну з самых буйных партый фальшывых долараў, якія сёлета канфіскоўваліся беларускімі праваахоўнымі органамі, — каля 25 тысяч долараў. Звычайны грамадзянін наўрад ці адрозніў бы фальшывыя долары з гэтай партыі ад сапраўдных. Яны прызначаліся для збыту на «ценявым» валютным рынку — праз валютчыкаў. Увезены ў Рэспубліку Беларусь праз тэрыторыю Смаленскай вобласці.**

Як паведаміў «Звяздзе» **палкоўнік міліцыі Сяргей КАЛАНТАЕЎ, начальнік 9-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі,** нядаўна была атрымана аператыўная інфармацыя пра канал пастаўкі фальшывых грашовых знакаў на тэрыторыю Беларусі. У сувязі з гэтым быў праведзены комплекс аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, па выніках якіх пры спробе збыту партыі фальшывых долараў быў затрыманы грамадзянін Расійскай Федэрацыі. У ходзе агляду машыны, на якой ён прыехаў, міліцыянеры знайшлі яшчэ каля 23 тысяч долараў ЗША. Расіянін планаваў «выручыць» ад фальшывых 1,6 тысячы долараў 500 сапраўдных долараў. Купляў фальшыўкі валютчык.

Як устанавілі эксперты, фальшыўкі выраблены з вельмі высокай якасцю. Купюры мелі адпаведныя ступені абароны, нават імітацыю вадзяных знакаў. Купюры былі наміналам па сто долараў, мелі розныя нумары і серыі. Пакуль што высвятляецца, дзе фальшыўкі вырабляліся.

Ці маглі б у пунктах абмену валюты вызначыць, што долары фальшывыя? Так! Што тычыцца асобы затрыманага, палкоўнік адзначыў, што яму за пяцьдзясят гадоў, ён — «асоба адной з каўказскіх нацыянальнасцяў», грамадзянін Расіі. У дачыненні да яго заведзены адразу дзве крымінальныя справы. Затрыманы можа быць пазбаўлены волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

З пачатку года на Віцебшчыне было зарэгістравана ўжо больш за 90 фактаў з'яўлення фальшывых грашовых сродкаў, у асноўным — долараў ЗША.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### «ПАЙШЛІ» ЖУРАВІНЫ АД НАСЕЛЬНІЦТВА

**Прадпрыемствы Белкаапсаюза распачалі нарыхтоўку гэтых ягад: у насельніцтва яе закуплена ўжо больш за 80 тон, што ў чатыры разы больш, чым было на аналагічную дату мінулага года. Дарэчы, штогод арганізацыі спажывецкай кааперацыі закупліваюць ад грамадзян звыш 1,5 тысячы тон журавін.**

Як паведамілі ў прэс-службе Белкаапсаюза, нарыхтоўка будзе праходзіць у верасні-кастрычніку, аднак калі ў насельніцтва будуць невялікія запасы, дык ягады будуць прымаць і ў наступныя месяцы. Закупачная цана на журавіны ўраджаю сёлетняга сезона вызначаная ў памеры 15 тысяч рублёў за кілаграм.

У сярэднім 80-90 працэнтаў ад аб'ёму закупленых ягад нарыхтоўчыя арганізацыі спажывецкай кааперацыі пастаўляюць на перапрацоўчыя прадпрыемствы краіны, 10-20 працэнтаў ідзе на продаж у свежым і перапрацаваным выглядзе праз рознічную гандлёвую сетку, рынкі, прадпрыемствы грамадскага харчавання, кірмашы, а таксама адгружаецца на экспарт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### 40-ГАДОВЫ РАБОЧЫ ЗАГІНУЎ АД УДАРУ ТОКАМ

**У грубым парушэнні тэхнікі бяспекі будаўнічых работ, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека, абвінавачваецца 44-гадовы жыхар Барысава. У дачыненні яго заведзена крымінальная справа.**

Паводле слоў **начальніка аддзела па наглядзе за следствам у органах пракуратуры Мінскай вобласці Аляксандра БЯЛІЦКАГА**, абвінавачваны ў кастрычніку 2007 года набыў для асабістых патрэб грузавы аўтакран. Калі дырэктар аднаго з прыватных прадпрыемстваў папрасіў арандаваць кран для будаўніцтва агароджы з жалезабетонных пліт на тэрыторыі прадпрыемства ў Барысаўскім раёне, не адмовіў. Больш за тое, узяўся сам выконваць работы. Як высветлілася, мужчына не меў права на работу машыністам аўтакрана і не ведаў у дадатковай ступені ўстройства сваёй тэхнікі. У выніку дапусціў шэраг грубых парушэнняў правіл бяспекі: самавольна ўстанавіў аўтакран у ахоўнай зоне высакавольтнай лініі электраперадач, пры кіраванні пад'ёмным механізмам па неасцярожнасці дапусціў судакрананне пад'ёмных канатаў крана з правадамі. З-за гэтага рабочы, які ўтрымліваў канат, атрымаў паражэнне электратокам і загінуў на месцы.

**Надзея ДРЫЛА.**

### НОВАЯ МАНЕТА З СЕРЫІ «ПРАВАСЛАЎНЫЯ ЦУДАТВОРНЫЯ ІКОНЫ»

**16 верасня ўводзіцца ў абарачэнне сярэбраная памятная манета «Ікона Прасвятой Багародзіцы «Жыровіцкая», паведамляе ўпраўленне інфармацыі Нацбанка.**

Прамавугольная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 31,1 грама і памер 30х45 міліметраў. Адчаканена на манетным двары ТАА «Б.Х. Маерс Кунстпрэгеншталь», Карлсфельд, Германія. Якасць — «пруф». Тыраж — да 10000 штук.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*



## ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 14 сентября 2011 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 09.09.2011 № 370 размер ставки рефинансирования установлен в размере 30 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 3 процентных пункта с 14.09.2011.

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишневка-2010» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже **зерносушильного комплекса**, расположенного по адресу: **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, район д. Юзуфово,** в составе: **зерносклад**, об. пл. 403,9 кв.м; **зерносклад**, об. пл. 690,8 кв.м, **склад минеральных удобрений**, об. пл. 140,2 кв.м; **площадка-ток**.

**Начальная цена с НДС (снижена на 10%) – 1 427 949 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **1,4228 га.**

Задаток в сумме 100 000 000 бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, БИК 153001369, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

*Подробное извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 09.08.2011.*

Аукцион состоится **29.09.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.09.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

## БАНКІ БЕЛАРУСІ З 14 ВЕРАСНЯ ЗМЕНЯЦЬ КУРСЫ КУПЛІ І ПРОДАЖУ ВАЛЮТЫ Ў ФІЗІЧНЫХ АСОБ

**Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.**

«У мэтах пераходу да збалансаванага функцыянавання наяўнага валютнага рынку і ў сувязі з адкрыццём дадатковай гандлёвай сесіі на ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» Нацыянальны банк рэкамендаваў банкам пры ўстанаўленні абменных курсаў замежных валют для правядзення валютна-абменных аперацый з удзелам фізічных асоб арыентавацца на курсы, якія склаліся па выніках дадатковай гандлёвай сесіі», — адзначылі ў Нацбанку. Іншымі словамі, пасля правядзення першых таргоў на дадатковай сесіі 14 верасня банкі зменяць раней устаноўленыя абменныя курсы куплі і продажу замежных валют.

У той жа час банкам неабходна правесці арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы па куплі і дастаўцы наяўнай замежнай валюты. «Улічваючы гэту акалічнасць, на першапачатковым этапе банкі будуць ажыццяўляць продаж наяўнай замежнай валюты фізічным асобам у межах наяўнай у іх валюты і па магчымасці падмацоўваць абменныя пункты (касы) за кошт існуючай наяўнай замежнай валюты», — растлумачылі ў Нацбанку.

## НАЦБАНК ДАЗВОЛІЎ РАЗЛІКІ Ў ВАЛЮЦЕ Ў БЕЛАРУСІ ПРЫ АКАЗАННІ ПАСЛУГ ФІЗІЧНЫМ АСОБАМ-НЕРЭЗІДЭНТАМ

**У мэтах павышэння зацікаўленасці суб'ектаў гаспадарання ў нарошчванні экспарту паслуг, стымулявання паступлення экспартнай валютнай выручкі ў краіну Нацыянальны банк Беларусі дазволіў правядзенне разлікаў у замежнай валюце на тэрыторыі рэспублікі пры аказанні шэрагу паслуг фізічным асобам — нерэзідэнтам. Адпаведнае пісьмо Нацбанка ад 13 верасня 2011 года нумар 31-13/608 накіравана ўсім банкам для прымянення ў рабоце і інфармавання сваіх кліентаў, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.**

Выдадзены дазвол ахоплівае турыстычныя паслугі, медыцынскія, паслугі ў сферы гасцінічнага бізнесу, паслугі аздараўленчых устаноў (санаторыяў, прафілакторыяў, дамоў адпачынку, турбаз), па навучанні, стажыроўцы і павышэнні кваліфікацыі.

Разлікі ў замежнай валюце могуць ажыццяўляцца шляхам унясення фізічнай асобай — нерэзідэнтам — наяўнай замежнай валюты ў касу банка для яе залічэння (пералічэння) на рахунак суб'екта гаспадарання ў Беларусі.

Такім чынам, на падставе выдадзенага дазволу любы суб'ект гаспадарання, які аказвае названыя паслугі фізічным асобам — нерэзідэнтам, мае права без праходжання яго службовымі асобамі тэсціравання ў Нацбанку на веданне норм валютнага заканадаўства атрымліваць замежную валюту пры дапамозе правядзення разлікаў праз касу банка, абмінаючы касу прадпрыемства.

Перавагай такіх разлікаў з'яўляецца зніжэнне выдаткаў прадпрыемства (адсутнічае неабходнасць у арганізацыі работы касы прадпрыемства, найме касавага работніка, закупцы дадатковых матэрыялаў і спецыяльных тэхнічных сродкаў для вызначэння сапраўднасці і плацежнасці наяўнай замежнай валюты, аплаце інкасацыі ў банк валютнай выручкі).

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ УКАЗ АБ УТВАРЭННІ СЛЕДЧАГА КАМІТЭТА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 12 верасня падпісаў указ № 409 «Аб утварэнні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь».**

У адпаведнасці з дакументам для ўтварэння Следчага камітэта будуць выдзелены следчы апарат з сістэмы органаў пракуратуры, падраздзяленне папярэдняга расследавання з сістэмы органаў унутраных спраў і сістэмы органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Вызначаны статус Следчага камітэта як дзяржаўнага праваахоўчага органа і органа папярэдняга следства, які падпарадкаваны Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляе ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі паўнамоцтвы ў сферы дасудовага крымінальнага вядзення па справе.

Акрамя таго, выбудавана адзіная цэнтралізаваная сістэма, якую будуць складаць Следчы камітэт (цэнтральны апарат), упраўленні па абласцях і Мінску, а таксама раённыя (міжраённыя), гарадскія, раённыя ў гарадах аддзелы Следчага камітэта.

Указам таксама замацаваны асноўныя задачы новага ведамства, у тым ліку ўсебаковае, поўнае, аб'ектыўнае і аператыўнае расследаванне злачынстваў, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян, захаванне законнасці пры праверцы, разглядзе заяў і папярэдняга расследавання злачынстваў, завядзенні крымінальных спраў, вядзенні папярэдняга следства.

Старшыня Следчага камітэта, яго намеснікі і начальнікі ўпраўленняў па абласцях і Мінску будуць назначацца на пасады Прэзідэнтам.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2012 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АШЧАДНЫ БАНК РАСІІ ВЫДЗЕЛІЦЬ «БЕЛАРУСЬКАЛІЮ» $1 МЛРД КРЭДЫТУ БЕЗ ПАТРАБАВАННЯ ЗАКЛАДУ АКЦЫЙ

**Аб гэтым БЕЛТА паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей РУМАС.**

«У мэтах стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным валютным рынку дасягнута пагадненне з Ашчадным банкам Расіі аб прыцягненні адкрытым акцыянерным таварыствам «Беларуськалій» крэдытных рэсурсаў у аб'ёме $1 млрд», — сказаў ён.

Сяргей Румас падкрэсліў, што пры гэтым у адпаведнасці з дамоўленасцямі прадастаўленне ў заклад акцый «Беларуськалія» ў якасці забеспячэння вяртання крэдыту не прадугледжваецца.

Даля ГРЫБАЎСКАЙТЭ:

## «Беларускую апазіцыю цікавяць толькі грошы»

**Такую думку выказала Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ ў інтэрв'ю літоўскаму радыё, паведамляе БЕЛТА.**

Паводле слоў Далі Грыбаўскайтэ, прадстаўнікі беларускай апазіцыі амаль не гавораць аб незалежнасці, а проста «імкнуцца атрымаць больш грошай».

Прэзідэнт растлумачыла: «Калі гутарыш або чуеш, як размаўляюць некаторыя прадстаўнікі апазіцыі, то часцей за ўсё не чуеш, што іх прыярытэтам і мэтай з'яўляецца незалежная Беларусь». «Часцей за ўсё чуем, што трэба больш грошай, і што Расія, у прынцыпе, сябар. Гэта, несумненна, выклікае ў нас пэўную занепакоенасць, паколькі нацыянальным інтарэсам Літвы з'яўляецца незалежны сусед, незалежная краіна», — падкрэсліла Даля Грыбаўскайтэ.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА КАТЭГАРЫЧНА СУПРАЦЬ ПЕРАНОСУ ТЭРМІНАЎ РЭАЛІЗАЦЫІ ІНВЕСТПРАЕКТА «МІНСК-СІЦІ» І ЗМЯНЕННЯ ЯГО КАНЦЭПЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У той жа час старшыня КДК лічыць магчымай далейшую рэалізацыю інвестпраекта з «Ітэрай» пры дадатковых гарантыях з боку інвестара аб своечасовасці выканання ўсіх этапаў праекта, прадастаўленні беларускаму боку магчымасцяў па прыцягненні іншых зацікаўленых інвестараў пры недастатковым фінансаванні «Мінск-Сіці» пры запланаваных аб'ёмах капітальных укладанняў і зрыве тэрмінаў будаўніцтва. На думку старшыні Камітэта дзяржкантролю, неабходна таксама стварыць каардынуючы орган з уключэннем у яго прадстаўнікоў усіх зацікаўленых бакоў у мэтах арганізацыі пастаяннага кантролю за ходам рэалізацыі праекта і канструктыўнага разгляду ўзнікаючых праблемных пытанняў.

Як далажыў старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька, сумарны аб'ём прамых укладанняў дзяржавы за ўвесь перыяд рэалізацыі праекта складзе каля $2 млрд, уключаючы стварэнне інфраструктуры, кошт зямлі і прадастаўленыя кампаніі прэферэнцыі. На думку сталічных улад, у Беларусі ёсць магчымасці, каб гэты праект рэалізоўваць.

Так, першым этапам будаўніцтва плануецца ўзвесці 225 тыс. кв.м жылля, тры паркінгі на 1,5 тыс. аўтамабіляў, гандлёвы цэнтр і адміністрацыйна-офісны будынак. Яго рэалізацыя запатрабуе ўкладання $30-37 млн. Па дагаворы тэрмін завяршэння першага этапу будаўніцтва — 2013 год. Інвестар выступіў з прапановай аднесці тэрміны здачы аб'ектаў на 2014 год.

Што датычыцца вынасу авіярамонтнага завода, то, паводле слоў Мікалая Ладуцькі, усе работы неабходна пачаць не пазней за сакавік 2012 года.

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч таксама лічыць, што інвестпраект можа быць ажыццёўлены, і падкрэсліў, што бярэ яго рэалізацыю пад уласнае куратарства.

«Я разумею, што ўрад гэтым праектам не займаўся, але майце на ўвазе, што вы за яго з сённяшняга дня адказваеце. І я вам раю не чакаць 2013 года», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да прэм'ер-міністра.

У сваю чаргу старшыня савета дырэктараў міжнароднай групы кампаній «Ітэра» Ігар Макараў адзначыў, што праект цяпер не мае той прывабнасці, як у пачатку работы над ім. Ён таксама заклікаў да больш цеснай каардынацыі зацікаўленыя дзяржаўныя органы і звярнуў увагу на неабходнасць чыноўнікам хутчэй вырашаць бягучыя бюракратычныя пытанні.

Звяртаючыся да Ігара Макарава, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Я са свайго боку зрабіў усё, аб чым вы прасілі, і нават больш таго. Не спрабуйце мяне сёння пераканаць, што тут хтосьці вінаваты, але толькі не вы — гэта марнаванне часу!»

«Ніякіх пераносаў тэрміну больш не будзе! Ніякіх ільгот дадаткова не будзе! Усё, што на сённяшні дзень існуе: можаш — будуй, не можаш — прыйдзі і скажы, што не можам мы ў гэтых умовах будаваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, у такім выпадку рэалізацыя гэтага праекта будзе прапанавана іншым інвестарам, якія ўжо сёння выказваюць сваю зацікаўленасць. «Ну, калі не можа сёння Макараў тут аб'ектыўна будаваць, не падабаецца, стратны праект або яшчэ нешта — аддайце яму тое, што ён можа будаваць. А астатняе няхай будуюць іншыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Запомніце: першы этап — гэта канец гэтага года, калі па ўсіх напрамках не будзе вырашэння, значыць, у студзені трэба прымаць кардынальнае рашэнне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нараўне з урадам роўную адказнасць за рэалізацыю праекта нясе і Мінгарвыканкам. «Сітуацыя такая, што трэба дзейнічаць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца авіярамонтнага завода, то, на думку Прэзідэнта, яго неабходна захаваць, каб не страціць каштоўных спецыялістаў. «Вы павінны ўжо даўно мець стратэгічнага інвестара па гэтым заводзе. Нам патрэбны завод», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаўся катэгарычна супраць змянення ўжо адобранай канцэпцыі будаўніцтва адміністрацыйна-дзелавога і грамадскага цэнтра і жылога раёна «Мінск-Сіці» ў бок ушчыльнення жылой забудовы і насычэння тэрыторыі вышыннымі будынкамі.

«Ніякай перапланіроўкі быць не павінна! Мы цэнтр Мінска сюды перамяшчаем. Гэта твар, мы не можам тут узяць і пабудаваць «куратнікі». І са шматпавярховасцю хопіць жартаваць!» — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што прынята рашэнне аб стрымліванні будаўніцтва жылля ў сталіцы. Паводле яго слоў, неабходна забудоўваць гарады-спадарожнікі, каб разгрупаваць прадукцыйныя сілы.

Падводзячы вынікі праведзенай размовы, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў выпадку нежадання кампаніяй «Ітэра» працягваць удзел у рэалізацыі праекта, у студзені 2012 года будуць знойдзены новыя інвестары, гатовыя на такіх умовах і згодна з зацверджаным планам узводзіць «Мінск-Сіці».

«Але хопіць карміць мяне абяцаннямі!» — паставіў кропку Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## «ГАЗПРАМ» АДЗНАЧАЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПЕРАГАВОРАЎ З БЕЛАРУССЮ ПА ЦАНЕ НА ГАЗ

**Учора ў цэнтральным офісе ААТ «Газпрам» адбылася чарговая сустрэча старшыні праўлення Аляксея Мілера і першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра СЯМАШКІ, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе «Газпрама».**

Бакі прадоўжылі перагаворы па ўмовах паставак і транзіту расійскага газу, у прыватнасці — па ўзроўні цаны на газ. У адпаведнасці з дасягнутымі ў ліпені дамоўленасцямі, вырашэнне гэтых пытанняў звязана з вызначэннем параметраў набыцця «Газпрамам» 50 працэнтаў акцый ААТ «Белтрансгаз».

«Аляксей Мілер і Уладзімір Сямашка адзначылі прадукцыйнасць бягучага дыялогу і выказалі ўпэўненасць у тым, што завяршыць перагаворы і падпісаць новы кантракт на пастаўку і транзіт газу стане магчымым у пачатку снежня 2011 года», — адзначылі ў прэс-службе ААТ «Газпрам».

31 снежня 2006 года ААТ «Газпрам» і ААТ «Белтрансгаз» падпісалі кантракт на пастаўку і транзіт газу ў 2007-2011 гадах. Дакументам, у прыватнасці, была вызначана формула цаны з 1 студзеня 2008 года (якая адпавядае формуле цаны пры пастаўках расійскага газу ў Еўропу), а таксама паніжаючыя каэфіцыенты цаны на 2008-2010 гады (0,67, 0,8 і 0,9 адпаведна). У жніўні 2011 года старшыня ўрада Расіі Уладзімір Пуцін даручыў Міністэрству энергетыкі Расіі і ААТ «Газпрам» вызначыць велічыню паніжаючага каэфіцыента цаны на газ для Беларусі з 2012 года. ААТ «Газпрам» мае 50 працэнтаў акцый ААТ «Белтрансгаз».

# Я размаўляю па-беларуску з... камп'ютарам

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Ці ёсць якія-небудзь цяжкасці з распрацоўкамі?***

**Юрась ГЕЦЭВІЧ:**

— Складанае пытанне — пастаноўка націскаў у словах. Складанасці таксама ёсць з абрэвіятурамі, лічбава-літарнымі абазначэннямі (напрыклад, назвы самалётаў, верталётаў, хімічныя формулы і іншае). І яшчэ: калі чытанне нейкага тэхнічнага тэксту можа быць здавальняючым, то літаратурны тэкст выклікае шмат нараканняў.

***— Вельмі часта можна пачуць, што ўсё беларускамоўнае не мае ніякіх перспектыў, што яно нікому не патрэбна. Ці не будзе так і з гэтым сінтэзатарам?***

**Юрась ГЕЦЭВІЧ:**

— Звычайна так кажуць у Беларусі. Калі выязджаеш за мяжу, там усе гэтым цікавяцца і з задавальненнем вывучаюць нашу мову. Ужыванне беларускай мовы памяншаецца, але зараз ёсць новае пакаленне, якое цікавіцца ўсім беларускім. Да таго ж шмат беларускамоўных сайтаў з'яўляецца. А значыць, і гэтыя сінтэзатары беларускай мовы могуць быць запатрабаваны моладдзю для таго, каб чытаць RSS-рассылкі, пераводзіць кнігі ў аўдыёфармат. І гэта, несумненна, будзе спрыяць развіццю беларускай мовы.

**P.S.** *Пасля размовы Юрась Гецэвіч прапанаваў мне паглядзець і пачуць, як працуе беларускамоўны сінтэзатар. Звычайны мужчынскі голас, толькі з металічным, як бывае ў фантастычных фільмах, прыгукам, перадаў прывітанне нашай газеце імгненна пасля таго, як Юрась надрукаваў некалькі слоў на клавіятуры. Яшчэ адна адметнасць камп'ютарнага голасу — невялікае замаруджванне пры «чытанні» вялікіх слоў. Асабліва гэта заўважаецца пры прайграванні паэтычных твораў. Так, я паслухаў «А хто там ідзе?» Янкі Купалы і ўрывак «Мой родны кут...» з паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа. А вось выкананне навуковага тэксту амаль цалкам задавальняе: калі не асабліва прыдзірацца, то і не адрозніш ад чалавека.*

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Прэс-канферэнцыі

# У 60-ці ПРАЦЭНТАЎ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛЬНІКАЎ ЗАПЛЕЧНІКІ — НЕПАД'ЁМНЫЯ...

**«З боку Міністэрства аховы здароўя за апошнія гады было зроблена шмат захадаў для таго, каб папярэдзіць развіццё ў беларускіх дзяцей і падлеткаў школьназалежных захворванняў», — пра гэта заявіла журналістам падчас прэс-канферэнцыі загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.**

Пад школьназалежнымі захворваннямі маюцца на ўвазе, у першую чаргу, праблемы са зрокам і парушэнні пастаці. Так, летась парушэнні вастрыні зроку назіраліся ў 19,8 працэнта дзевяцікласнікаў, а парушэнні пастаці дыягнаставаліся ў 13,9 працэнта вучняў дзявятых класаў.

Менавіта таму галоўны акцэнт быў зроблены санітарна-эпідэміялагічнай службай на забеспячэнне школ новай вучнёўскай мэбляй, бяспечнай камп'ютарнай тэхнікай, а таксама на паляпшэнне штучнага асвятлення рабочых месцаў. Сёння практычна ва ўсіх навучальных установах рэканструяваныя сістэмы штучнага асвятлення: устаноўлены новыя лямпы з выкарыстаннем электронных пускарэгулюючых прыбораў і нязначным эфектам мігцення. У пачатковых класах забараняецца ставіць для вучняў сталы — толькі вучнёўскія парты. Летась пачалі дзейнічаць новыя гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, утрымання і арганізацыі адукацыйнага працэсу ў агульнаадукацыйных установах.

— У новых гігіенічных патрабаваннях, у прыватнасці, была занатаваная вага штодзённага камплекту падручнікаў для навучэнцаў, — патлумачыла Ала Малахава. — А яшчэ раней мы ўвялі абмежаванні па вазе школьных падручнікаў. Калі з'явіліся першыя беларускія падручнікі, то вага некаторых з іх даходзіла да 600-700 грамаў. Цяпер дзейнічаюць жорсткія патрабаванні: калі размова ідзе пра падручнік для вучняў пачатковай школы, то ён не можа важыць больш як 300 г, для вучняў 4—6-х класаў — не больш як 400 г, для 7—9-х класаў — не больш як 500 г, для старшакласнікаў — да 600 г. У выпадку, калі ўмясціць увесь аб'ём інфармацыі ў кнігу такой вагі немагчыма, падручнік павінен быць падзелены на дзве часткі.

Разам з пісьмовымі прыладамі вага штодзённага камплекта падручнікаў для вучняў 1-га і 2-га класаў школ не павінна перавышаць 1,5 кг. Для вучняў 3-4 класаў — 2,5 кг, 5-х і 6-х — 3 кг, 7-х і 8-х — 3,5 кг і 9-11-х класаў — 4 кг. Прычым педагогі павінны сачыць за вагой школьных сумак сваіх выхаванцаў. Па словах Алы Малахавай, калі санітарныя ўрачы правяралі вагу школьных сумак, то на свае вочы пераканаліся, што прыкладна 60 працэнтаў дзяцей носяць там шмат лішніх прадметаў (непатрэбных падручнікаў, энцыклапедый, кніг, гульняў і гэтак далей), якія яны элементарна забываюць адтуль дастаць (асабліва гэта тычыцца вучняў пачатковай школы). У пачатковай школе ўвогуле павінны быць прадугледжаны індывідуальныя шафы-ячэйкі або ўбудаваныя шафы для захоўвання прылад для ўрокаў працоўнага навучання, кніг для дадатковага чытання ў класе, падручнікаў, энцыклапедый і вучэбных дапаможнікаў.

**Разам з пісьмовымі прыладамі вага штодзённага камплекта падручнікаў для вучняў 1-х і 2-х класаў школ не павінна перавышаць 1,5 кг, для вучняў 3 і 4-х класаў — 2,5 кг, 5-х і 6-х — 3 кг, 7-х і 8-х — 3,5 кг і 9-11-х класаў — 4 кг.**

— Трэба мець на ўвазе, што толькі набор гуашы важыць кілаграм, таму насіць яго ў ранцы ці заплечніку дзіцяці штодня не трэба, — дадала Ала Малахава. — Лепш пакінуць яго ў школе. Тое ж можна сказаць і пра шматлікія энцыклапедыі, дадатковыя сшыткі, альбомы і г. д. Пры праектаванні, будаўніцтве і рэканструкцыі будынкаў агульнаадукацыйных устаноў індывідуальныя шафы павінны быць прадугледжаны таксама і для вучняў старэйшых класаў — на еўрапейскі ўзор.

Ала Малахава расказала журналістам і пра гігіенічныя патрабаванні да вучнёўскіх ранцаў, заплечнікаў і партфеляў: вага скургалантарэйных вырабаў, разлічаных на вучняў пачатковых класаў, павінна быць не большая за 600-700 г. А заплечнік ці партфель, разлічаны на навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў, павінен важыць не больш за кілаграм. **Значыць, агульная вага заплечніка старшакласніка разам з камплектам падручнікаў павінна быць у межах 5 кг.** Акрамя вагі, была абмежаваная таксама шырыня партфеля, яго вышыня і нават колькасць накладных кішэняў, бо чым больш кішэняў, тым большай будзе ў падлетка спакуса пакласці туды нешта лішняе.

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт медыцынскага суправаджэння эксперыменту па ўкараненні ў навучальным працэсе ў пачатковай школе нэтбукаў, спецыяліст паведаміла:

— Пра масавы пераход школы на выкарыстанне нэтбукаў гаварыць пакуль заўчасна. Увогуле падчас эксперыменту будзе вывучацца мэтазгоднасць выкарыстання нэтбукаў у навучальным працэсе. Ці прынясе яно чаканы педагагічны эфект? І тым больш не варта думаць, што нэтбук заменіць школьнікам кнігу. Варта мець на ўвазе, што чытанне кніг не толькі трэніруе зрокавую памяць, але і спрыяе развіццю ў дзяцей пісьменнасці, чаго не скажаш пра камп'ютары. Прызнаюся, што мы занепакоеныя даволі невялікім экранам нэтбукаў. Паколькі раней нэтбукі ў школах не выкарыстоўваліся, то і адпаведных гігіенічных нарматываў не існуе: трэба будзе вызначыць, якім павінен быць шрыфт, бяспечны для дзіцячага вока, якім павінен быць фон, кантраснасць экрана, устанавіць адлегласць паміж радкамі і г. д. Пакуль што жорстка рэгламентуецца час, на працягу якога дазваляецца выкарыстоўваць на ўроку нэтбук — не больш за 15 хвілін. Хоць, шчыра кажучы, час, які дзіця праводзіць перад хатнім камп'ютарам, не кантралюе ніхто, нават бацькі. І менавіта дома дзеці губляюць свой зрок. Між іншым, камп'ютары ёсць дома ў 80 працэнтаў беларускіх школьнікаў...

**Вучні 2-х класаў павінны траціць на выкананне хатніх заданняў не больш чым 1,2 гадзіны, 3-х і 4-х класаў — 1,5 гадзіны. Час, затрачаны на выкананне задання па адным вучэбным прадмеце, не павінен перавышаць у 2-м класе 20 хвілін і 30 хвілін — у 3-м і 4-м класах. У 5-х і 6-х класах на выкананне хатніх заданняў адводзіцца максімум 2 гадзіны, у 7-х і 8-х — да 2,5 гадзіны і ў 9—11-х — да 3 гадзін.**

Яшчэ адно пытанне тычылася сёлетняй школьнай калекцыі адзення, якую многія бацькі раскрытыкавалі з-за засілля ў вырабах беларускіх вытворцаў сінтэтыкі:

— У беларускіх СанПІНах і сапраўды раней прысутнічалі абмежаванні па колькасці хімічных валокнаў у школьным адзенні. Але мы ўступілі ў Мытны саюз, і цяпер у нас дзейнічаюць адзіныя санітарныя правілы, — паведаміла Ала Малахава. — А паколькі ў Расіі і Казахстане такога паняцця, як «школьнае адзенне» не існуе, то і нарміраванне наяўнасці хімічных валокнаў у адзіных санітарных правілах не прадугледжана. Праўда, такі паказчык, як «колькасць хімічных валокнаў», не заўсёды адлюстроўвае фізіка-гігіенічныя параметры адзення: камфортнасць адзення вызначаецца найперш паветрапранікальнасцю і гіграскапічнасцю тканін. На мой погляд, ніхто не можа прымусіць бацькоў купляць тое адзенне, у якім, на іх думку, дзіцяці будзе некамфортна. Кожны выраб у нас абавязкова маркіруецца, і калі на ім пазначана, што адзенне прызначана для святочных выпадкаў, трэба падумаць, а ці будзе дзіцяці ў ім камфортна на працягу ўсяго школьнага дня. Варта мець таксама на ўвазе, што калі для адных бацькоў на першы план выходзіць склад тканін, то для іншых не меншае значэнне мае і цана вырабу. Можна думаць, што ў гэтым годзе беларускімі вытворцамі быў зроблены акцэнт якраз на выпуск больш таннага школьнага адзення...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Абзац

◢ **На праспекце Дзяржынскага ў Мінску, паблізу выезду на МКАД, «БМВ-525» страціў кіраванне, з'ехаў у кювет і перакуліўся. У салоне было 5 чалавек, усе — нецвярозыя. Трое з пацярпелых шпіталізаваныя з рознымі траўмамі, двое абышліся лёгкім перапудам. ДТЗ адбылося 12 верасня каля 18.20. Вядзецца праверка.**



◢ У Магілёве ўсталявалі «ўсмешлівыя» святлафоры, паведамляе Gorad.by. Смайлікі размясцілі на секцыях жоўтага колеру. Па словах супрацоўнікаў ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама, зроблена гэта для паляпшэння настрою ўдзельнікаў дарожнага руху і папярэджання магчымых канфліктных сітуацый паміж імі. Пакуль усмешкамі ўпрыгожылі толькі 5 секцый святлафораў, але ідэя спадабалася многім жыхарам горада, таму можна чакаць, што такіх святлафораў стане больш.

## Поўны абзац



◢ **Пабіты рэкорд самай доўгай касы Украіны. Яе носіць жыхарка Прыкарпацця Вольга Ламака — настаўніца малодшых класаў вясковай школы. Касу яна гадуе з дзяцінства. У 5 гадоў сказала маме, што стрыгчыся не будзе, і сваё слова стрымала. Дагледзець валасы няпроста — дзяўчына прычэсваецца каля 3 гадзін. Даўжыня касы — 160 см, а рост Волі — 150.**

◢ Цэлае змяінае гняздо выявілі супрацоўнікі адной са станцый тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў у Днепрапятроўску. Работнікі СТА пазванілі ў гарупраўленне МНС і паведамілі, што каля ўезду ў памяшканне з-пад фундамента выпаўзаюць змеі. Калі супрацоўнікі атрада спецыяльнага прызначэння МНС прыбылі на месца, то ўбачылі пад фундаментам будынка галовы змей. З дапамогай спецыяльнага абсталявання было выяўлена 5 гадзюк і 8 полазаў. Вылаўленых гадаў змяяловы вывезлі за горад і выпусцілі.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АБАМА ПРЫЗНАЎ СВАЕ ПАМЫЛКІ

**Прэзідэнт ЗША Барак Абама прызнаўся, што рабіў памылкі ў барацьбе з эканамічным крызісам пасля абрання на прэзідэнцкі пост. Пра іх кіраўнік Белага дома распавёў у інтэрв'ю нямецкаму агенцтву DPA.**

Па словах Абамы, неўзабаве пасля ўступлення на пасаду ён не ведаў шмат чаго, што ведае цяпер, і гэта паўплывала на некаторыя яго рашэнні. Менавіта аслабленую эканоміку ЗША рэспубліканцы ставяць у віну Бараку Абаме перад прэзідэнцкімі выбарамі 2012 года. Яго таксама вінавацяць у тым, што за тры гады яго кіравання ўзровень беспрацоўя вырас да 9,1 працэнта. Асабліва востры канфлікт з апанентамі паўстаў падчас абмеркавання максімуму дзяржаўнага запазычання, якое ледзь не прывяло да тэхнічнага дэфолту. Абама падкрэсліў, што ў момант, калі ён заняў пост прэзідэнта, сітуацыя ў краіне была вельмі цяжкай.

### СТЫХІЯ БУШУЕ Ў ЕЎРОПЕ І АЗІІ



**У Тайландзе ў выніку паводак загінулі 82 чалавекі.**

З-за праліўных дажджоў, што абрушыліся на краіну ў панядзелак, затоплены 35 правінцый на поўначы, поўдні, усходзе і ў цэнтры краіны. Цяпер узровень вады каля большасці дамбаў і загарод, узведзеных для абароны ад паводак, перасягае 80 працэнтаў максімальнай загрузкі. У зоне рызыкі раптоўнага затаплення знаходзіцца амаль 600 тысяч чалавек.

Да чалавечых ахвяр прывёў і ўраган «Каця», які разбушаваўся ў панядзелак над тэрыторыяй Вялікабрытаніі. У горадзе Дарэм на паўночным усходзе Англіі моцны вецер паваліў дрэва, і яно ўпала на машыну. Вадзіцель загінуў, пасажыр у бальніцы. Ураганныя вятры хуткасцю да 130 км/г, а таксама ліўневыя дажджы абрушыліся на шэраг раёнаў Шатландыі, Паўночнай Ірландыі, Уэльса і паўночнай Англіі. У многіх раёнах была парушана работа марскіх паромаў, адзначаны выпадкі спынення цягнікоў з-за дрэў і галін, што ўпалі на пуці.

### АМЕРЫКАНЦЫ ВЫДАТКУЮЦЬ НА БЕНЗІН РЭКОРДНУЮ СУМУ



**За 2011 год амерыканцы выдаткуюць на бензін 491 мільярд долараў, паведамляе The Los Angeles Times. Гэтая сума стане рэкорднай за ўсю гісторыю ЗША, нягледзячы на тое, што спажыванне бензіну ў 2011 годзе значна паменшылася.**

Паводле звестак міністэрства энергетыкі ЗША, краіна выкарыстоўвае на 157 тысяч барэляў паліва ў дзень менш у параўнанні з папярэднім годам. Гэта шмат у чым звязана з урадавай прапагандай электрамабіляў і гібрыдаў, якая пачалася пасля паліўнага крызісу 2008 года. У 2008 годзе павелічэнне коштаў на бензін насіла кароткачасовы характар і мала адбілася на агульных выдатках на паліва, тады як у 2011 годзе бензін стабільна даражэе на працягу некалькіх месяцаў і ў найбліжэйшы час цэны не будуць зніжацца. Сярэдняя цана бензіну за 2011 год аказалася на 12 працэнтаў вышэй, чым за 2008 год. За год паліва падаражэла прыкладна на 30 працэнтаў. Амерыканцы плацяць за літр бензіну крыху больш за долар.

### У МАСКВЕ ЖЫЎЦОМ СПАЛІЛІ ПЕНСІЯНЕРА

**У сталіцы РФ уначы жыўцом спалілі пенсіянера. Невядомыя напалі на мужчыну 1954 года нараджэння, збілі яго і аблілі бензінам.**

Пацярпелы пенсіянер быў шпіталізаваны з цяжкімі апёкамі 72 працэнтаў паверхні цела. Паліцыя праводзіць праверку, па выніках якой будзе вырашана пытанне аб завядзенні крымінальнай справы. Падобны выпадак адбыўся ў Калузе ў жніўні. Каля Вечнага агню падлеткі распівалі алкагольныя напоі, сумяшчаючы іх з медыцынскімі прэпаратамі. Ім на вочы трапіўся бяздомны, які спаў у траве. Спачатку аб цела бамжа тушылі недакуркі, а затым аблілі бензінам, прынесеным з дому, і падпалілі. Пацярпелы сканаў.

Спорт

## «Дынама» з перамогі стартавала ў КХЛ

**Адкладзены старт мінскага «Дынама» ў КХЛ адбыўся ў панядзелак. Трагедыя ў Яраслаўлі яшчэ доўга будзе нагадваць аб сабе і балельшчыкам, і хакеістам. Калі на матч з «Лакаматывам» анансаваўся аншлаг (за дзень да яго было раскуплена большая частка — 11 тысяч білетаў), то ў панядзелак «Мінск-арэна» аншлагу не сабрала. Не ў лепшым стане і гульцы, якім трэба выйсці на лёд і прадэманстраваць, што жыццё працягваецца. Паводле слоў Марэка Сікоры, не ў лепшым псіхалагічным стане знаходзіцца варатар Андрэй Мезін, які страціў шмат сяброў у авіякатастрофе. Яго ў стартавым матчы супраць «Авангарда» вымушаны быў замяніць легіянер Кевін Лаланд.**

Тым не менш, старт атрымаўся ўдалым: 4:1. Нягледзячы на два першыя перыяды, якія для нашай каманды складваліся не лепшым чынам. Да пачатку заключнай трэці мінчане саступалі 0:1. Маглі і больш, але некалькі разоў у матчы на дапамогу дынамаўцам прыходзіла штанга. Але ў трэцім перыядзе «Дынама» нарэшце разняволілася. Лік зраўняла чацвёртае, беларускае звяно. Пасля перадач Паўловіча і Стася вызначыўся Дзмітрый Мялешка. Праз некалькі хвілін «Дынама» вывеў наперад Лінглет — 2:1. І тут «Авангард» не скарыстаўся шыкоўнай магчымасцю аднавіць раўнавагу. Чэрвенка выйшаў адзін на адзін з Лаландам, абыграў яго і паслаў шайбу ў штангу. Затым у дынамаўцаў вызначыліся Міхалёў і Лінглет. 4:1 — і першая перамога мінчан у сезоне.

Марэк Сікора пасля матча прапанаваў не надта радавацца перамозе:

— Спачатку гулялі цяжка, нічога не атрымлівалася ў большасці. Трэба было дзейнічаць прасцей, а мы забіваліся ў куткі. Было няпроста, але паціху дадавалі. У трэцім перыядзе гэты вылілася ў галы. Выйгралі, але гэта ўсяго толькі маленькі крок на доўгай дыстанцыі, — рэзюмаваў галоўны трэнер.

## Штанге ўсё ж дадуць адпрацаваць кантракт цалкам

**Учора са спасылкай на расійскі «Спорт-Экспресс» мы паведамлялі, што галоўны трэнер нацыянальнай каманды па футболе Бернд Штанге можа не дапрацаваць да заканчэння адборачнага цыкла, у якім засталося правесці ўсяго адзін матч (7 кастрычніка супраць зборнай Румыніі), бо задача выхаду на чэмпіянат Еўропы аказалася нявырашанай.**

Аднак, як паведаміў «Прессболу» першы намеснік старшыні Беларускай федэрацыі футбала Сяргей Сафар'ян, звальняць датэрмінова нямецкага спецыяліста не плануецца:

— Бернд Штанге адпрацуе свой кантракт цалкам. Пагадненне з галоўным трэнерам заключана да лістапада гэтага года. Таму да яго заканчэння нямецкі спецыяліст паедзе ў Парыж на сустрэчу трэнераў нацыянальных зборных Іспаніі, Францыі, Беларусі, Грузіі і Фінляндыі, каб выпрацаваць каляндар гульняў у групе І на наступны адборачны цыкл. 7 кастрычніка ён выведзе нашу каманду на матч супраць Румыніі. А пасля на нарадзе з трэнерамі клубаў Бернд Штанге прааналізуе выступленне зборнай і падвядзе вынік сваёй працы (у Беларусі ён працуе з нацкамандай са жніўня 2007-га).

А вось далей, паводле слоў Сафар'яна, супрацоўніцтва са Штанге працягваць федэрацыя не плануе.

**Алена КРАВЕЦ.**

## У беларускіх барцоў — серабро чэмпіянату свету

**Беларускі спартсмен Элбек Тажыеў (вагавая катэгорыя да 55 кг) заваяваў серабро чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе, які праходзіць у турэцкім Стамбуле, паведамляе БЕЛТА.**

Акрамя таго, Элбек Тажыеў і Цімафей Дзейнічэнка (96 кг), якія занялі 5-е месца, заваявалі алімпійскія ліцэнзіі ў Лондан-2012. Тажыеў у схватцы за золата ўступіў Раўшану Байрамаву з Азербайджана, а Цімафей Дзейнічэнка ў паядынку за бронзу прайграў Чэнку Ілдэму з Турцыі. А вось бронзавы медаліст пекінскай Алімпіяды-2008 Міхаіл Сямёнаў завяршыў выступленне пасля другой схваткі, прайграўшы ў 1/8 фіналу Дархану Баяхметаву з Казахстана.



## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | Лот № 1 — Электромобиль детский «Ford»<br>Лот № 2 — Электромобиль детский «Jeep» 2-местный<br>Лот № 3 — Электромобиль детский «Jeep» 2-местный<br>Лот № 4 — Электромобиль детский «Jeep» 2-местный<br>Лот № 5 — Электромобиль детский «Jeep» 2-местный<br>Лот № 6 — Электромобиль детский «Jeep» 1-местный<br>Лот № 7 — Электромотоцикл детский<br>Лот № 8 — Электромотоцикл детский<br>Лот № 9 — Электромотоцикл детский |
| **Собственник (владелец) имущества** | ИП Сухих Ю.В. |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. Ак. Павлова, 48,<br>склад готовой продукции № 1. |
| **Стоимость имущества** | Лот № 1 — 571 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 2 — 571 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 3 — 571 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 4 — 571 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 5 — 571 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 6 — 331 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 7 — 107 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 8 —107 200 белорусских рублей (с учетом НДС)<br>Лот № 9 — 73 600 белорусских рублей (с учетом НДС) |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320<br>26 сентября 2011 года, в 12.00 |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 320<br>http://vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 49 13 49, (8 029) 663 53 24<br>Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 23.09.2011 г.<br>Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# Як беларускі дыджэй Рудзеня стварыў радыёстанцыю прама ў сваёй спальні

## І прыцягнуў да сябе на эфіры цэлы батальён ад беларускай эстрады



— Вось гэта ўзмацняльнік — кінапаўскі, савецкі. З яго раней у клубах круцілі кіно, музыку. Я абмяняў яго некалі на бабінны магнітафон, — паказвае 29-гадовы Паша Рудзеня абсталяванне «Мясцовага радыё». — Таксама тут магнітафон — можна ўключаць дыскі, можна ставіць музыку з флэшкі. Паўгода таму купіў ва ўнівермагу.

**— Няўжо з гэтым абсталяваннем ты выходзіў у эфір?**

— У гняздо для навушнікаў падлучаў штэкер, узмацняльнік падключаў да радыёкропкі. Вось мікрафон, зроблены з тэлефоннай трубкі. У яго размаўляў.

*Паша пачаў паказваць, як вяшчаў у той самы мікрафон-слухаўку: «Добры дзень, спадары і спадарыні, вы слухаеце «Мясцовае радыё». Ля пульта і ля мікрафона — Павел Рудзеня. Наперадзе навіны і прагноз надвор'я. Не забываемся, што мы з вамі — да 15.00...»*

— А гэта — самаробнае радыё, на ім — тумблер. Радыёкропка змаўкае, націскаеш на тумблер — і ты ў эфіры. Калі запісваю інтэрв'ю, то на вось гэты дыктафон, — паказвае Паша стары касетнік. Такім яшчэ гадоў восем таму карысталася большасць беларускіх журналістаў. — Піша вельмі добра... Калі, дырэчы, ёсць касеты, прынось мне...

*Паводле слоў Пашы, часам у яго эфірах прымалі ўдзел цэлыя гурты. У маленечкі пакой «Мясцовага радыё» музыкі змяшчаліся не заўсёды. Здаралася, нехта не пагаджаўся ехаць да Пашы на ўскраек горада, пад самую кальцавую: маўляў, далёка. Тады дыджэй узбройваўся гэтым самым касетнікам і запісваў інтэрв'ю з музыкамі дзе-небудзь на дварэ ў цэнтры сталіцы, пасадзіўшы гурт на лаву.*

**— І каго ты запісваў на гэты дыктафон? — пытаюся.**

— Зорак беларускай эстрады, якія сюды прыходзілі. Песня — інтэрв'ю, песня — інтэрв'ю — так і кляпаўся эфір...

*У гэты момант гутаркі ў пакой заходзіць сястра дыджэя: «Паша, дождж абяцалі?» «Абяцалі. І маланку», — парыруе дыджэй.*

*Паша Рудзеня ў курсе ўсіх апошніх навін і прагнозаў надвор'я, хоць і не можа самастойна праглядаць інтэрнэт. Адным з першых ён распавёў мне жалобную навіну пра гібель легендарнага беларускага хакеіста Руслана Салея, Сяргея Астапчука і Мікалая Крываносава пад Яраслаўлем...*

### «У кватэру чалавек сем ці восем заляцела. Я не прызнаваўся, што выходзіў у эфір...»

**— Ты ўвогуле нічога не бачыш?**

— Так.

**— Ад нараджэння?**

— Так, ад нараджэння, — прастадушна адказвае дыджэй і хваліцца сваімі новымі сонцаахоўнымі акулярамі. — Учора за 70 тысяч набыў. Прыгожыя?

**— Даволі класныя. Слухай, а як ты зрабіўся дыджэем?**

— Навучаўся я ў школе для дзяцей, якія слаба бачаць. А як радыё з'явілася ў маім жыцці? Калі быў малы, у школе аднойчы ўключыў магнітафончык у радыёкропку і ў разетку 220 вольт. Чую, музыка пайшла па школе. Прыехаў сюды, зрабіў гэтую ж аперацыю дома. Думаў, мяне чуваць толькі ў адным пад'ездзе. Пачаў мацюкацца ў эфіры. Суседзі паскардзіліся ў міліцыю, і прыехалі адкуль трэба. Гэта было 12 гадоў таму. Чалавек сем ці восем заляцела. Я не прызнаваўся, што падключаўся. А суседка, адна бабуля, сказала ім: «Ён больш такога рабіць не будзе». Я ж ёй гаварыў усё. Ніхто нічога не забраў, проста сказалі так больш не рабіць.

**Калі быў малы, у школе аднойчы ўключыў магнітафончык у радыёкропку і ў разетку 220 вольт. Чую, музыка пайшла па школе.**

Праз нейкі час эфіры пачаліся зноўку. Але мяне не чапалі. Напэўна, дзяржава разумела, што я нічога дрэннага не раблю. Вёў звычайныя лінейныя эфіры ў той час, калі радыёкропка з Першым нацыянальным каналам беларускага радыё змаўкала. Плюс запрашаў у госці зорак эстрады.

**— Ці шмат людзей цябе слухала?**

— На чатырох вуліцах. Раней тэлефанавалі падчас эфіраў нават з інтэрнатаў БДУ па вуліцы Курчатава.

**— А навошта тэлефанавалі? Павіншаваць кагосьці?**

— Не толькі. Я праводзіў розыгрышы прызоў. А грошы на іх зарабляў так: іграў на трубе ў пераходах, у вагонах метро.

**— Слухай, дык у такім разе я цябе не раз бачыў. Во, думаю, на кагосьці ты падобны!**

— Так і ёсць.

**— Ты хадзіў яшчэ з нейкім чалавекам.**

— Так, з сябрам. Частку грошай траціў на сябе, на астатнія купляў дыскі і разыгрываў у эфіры. Здаралася, выйграваў на адной радыёстанцыі, а разыгрываў на сваёй. Тыя ж дыскі і запрашальнікі ў клуб. У асноўным маімі слухачамі былі людзі пажылыя, але слухала і моладзь. За гадзіну эфіру тэлефанавала пяць-шэсць чалавек. Але сёння людзі прызвычаіліся больш слухаць, чым тэлефанаваць.

Узяць тое ж «Радыё Аплюс», з якім я сёння супрацоўнічаю: тэлефонных заявак за праграму можа быць дзве, а пісьмовых — дзвесце.

### «У мяне працуюць і настаўніцы, і студэнткі...»

**— І пра што вяшчала «Мясцовае радыё»? Які быў канцэпт?**

— Удзень — музычна-інфармацыйная праграма. Апроч песень гучалі навіны, курсы валют, прагнозы надвор'я. Навінамі дзяліліся дыджэі з іншых вядомых радыёстанцый.

Па начах — музыка і некаторыя праграмы. Напрыклад, з пятніцы на суботу — «Шансон-хіт». Добры шансон, без мацюкоў, культурны. У ноч з панядзелка на аўторак — праграма пра тутэйшыя спевы Беларусі. Яе, дырэчы, рыхтуе вядоўца з іншай станцыі, які даў дазвол выкарыстоўваць гэтую праграму ў маіх эфірах.

**— Я чуў, што ў цябе тут працаваў цэлы штат супрацоўнікаў...**

— Прыходзілі дзяўчаты, навіны розныя кур'ёзныя зачытвалі, музыку ставілі.

**— Дзяўчаты? Хто такія?**

— Чалавек дзесяць. Раней у мяне працавала Юля Лабанава, прыйшла ўжо пасля таго, як паступіла ў Інстытут журналістыкі.

**— Дык у цябе тут былі нармальныя кадры.**

— Так. Напрыклад, дзве Волі. Адна — настаўніца беларускай і рускай мовай у школе. Вера Паклонская, з якой мы намінаваліся на «прэмію Папова». Яна ў краме працавала, а зараз — у крутой фірме, бухгалтарам ці ў аддзеле кадраў. Дзяўчынка Насця, таксама настаўніца па мовах у школе. І іншыя.

**— А цэнзура ў вас на радыё ёсць?**

— Так. Не брыдкасловіць, у палітыку не лезці, — *сурова адрэзаў Паша.*

**— А што, бывалі выпадкі?**

— Гадоў пяць таму размаўлялі ў эфіры, і перастаў працаваць мікрафон. Я і так, і сяк, а ён не падключаецца. Я пачаў нервавацца і сказаў: «Б..., мікрафон не працуе», і ён запрацаваў. Я папрасіў прабачэння прама ў эфіры і паабяцаў, што такога больш не здарыцца. Цяпер я сябе так спакойна адчуваю, што ў выпадку тэхнічных праблем стараюся ўсё выправіць і пры гэтым спакойна трымацца.

### «З Сан-Францыска нам уручылі спецыяльную намінацыю, сказалі, што больш такую нікому не дадуць...»

**— Я бачу, у цябе вісяць постары з аўтографамі Жоры Калдуна, Івана Буслая. Хто ў цябе тут бываў на эфірах?**

— Ды ўсе перабывалі. Аляксандр Ціхановіч. Вельмі добры сябар, дапамагае і грашыма, і так. Былі Лёша і Андрэй Хлястовы. Была Іна Афанасьева. Ёй патэлефанавала чалавек 20. Простая, адкрытая.

**— І як праходзілі эфіры з «франтавікамі» эстрады?**

— Тэлефанавалі людзі, задавалі пытанні. Аднойчы Саладуху патэлефанавала толькі тры-чатыры чалавекі. Ён сказаў: «Мне мала людзей патэлефанавала, больш да вас не пайду». Гурт «Дразды» быў, Алеся. Карацей, усе былі. Дзяніс Дудзінскі прыходзіў як радыёвядоўца, задаваў яму пытанні: як патрапіў на радыё, як што было. Дыджэй Аляксандр Крывашэеў быў.

**— А замежнікі да цябе прыходзілі калі-небудзь?**

— Напісалі ліст у Маскву Дзянісу Майданаву. А праз некалькі дзён мяне запрасілі ў Палац Рэспублікі на інтэрв'ю. Праўда, на пытанні адказвала яго жонка — Наталля Майданава.

**— Летась пісалі пра тое, што ты стаў лаўрэатам «Прэміі Папова». Па ТБ сюжэты паказвалі...**

— Гэтую прэмію раней выдавалі ў Маскве і ў Пецярбургу. Але ў 2010 годзе нешта здарылася, нехта з кімсьці пасварыўся, і яна праходзіла ў Сан-Францыска. Была анлайн-канферэнцыя. Я выходзіў у сеціва ад свайго сябра-рэжысёра, які здымае пра мяне кіно, якое будзе паказвацца на фестывалях у Еўропе.

Нам тады далі спецыяльную намінацыю «За любоў да радыё», сказалі, што больш такую нікому не дадуць.

**— Грошай далі?**

— Не, уся прэмія — гэта статуэтка і грамата. Я іх дагэтуль не атрымаў. Але неўзабаве Дзмітрый Дзяргач (арганізатар «Прэміі Папова». — «Звязда») вернецца ў Маскву, і мы ўсе гэтыя пытанні ўладзім.

**У мяне сяброўка працуе на рынку ў Ждановічах. Яна пайшла перакусіць у «Сайгон» (азіяцкая кавярня. — «*Звязда*») і пачула мой голас, дык ледзь не папярхнулася ад нечаканасці. Нам падчас эфіраў часта тэлефануюць з крам, супермаркетаў. Нават аўтааматары тэлефануюць. Нядаўна дзяўчына з аўтобуса пазваніла.**

**— Паша, а з чаго ты ўвогуле жывеш?**

— Атрымліваю пенсію.

**— Ты такі шоумэн, і не зарабляеш на ўлюбёнай справе ні долара?**

— Але мне падабаецца мая работа. Ужо чатыры месяцы я працую на «Радыё Аплюс», якое вяшчае праз інтэрнэт. Гэта некамерцыйны праект. Там я вяду ранішняе шоў «Кафяёк», праграму па заяўках, і ў мяне сваё шоў ёсць: людзі тэлефануюць, расказваюць анекдоты, спяваюць песні. Мы выбіраем пераможцаў і раздаём падарункі. У нас вельмі добры калектыў, дырэктар...

**— І што, інтэрнэт-радыё слухаюць? Я дык уключаю прымач толькі ў машыне, слухаю FM-радыёстанцыі.**

— У мяне сяброўка працуе на рынку ў Ждановічах. Яна пайшла перакусіць у «Сайгон» (азіяцкая кавярня. — «Звязда») і пачула мой голас, дык ледзь не папярхнулася ад нечаканасці. Нам падчас эфіраў часта тэлефануюць з крам, супермаркетаў. Нават аўтааматары тэлефануюць. Нядаўна дзяўчына з аўтобуса пазваніла. Слухала наша інтэрнэт-радыё праз тэлефон...

*На гэтым першая частка нашай гутаркі скончылася. Паша рыхтаваўся да чарговага эфіру. На наступны дзень дыджэй запрасіў мяне да сябе на інтэрнэт-радыёстанцыю.*

### «Я з-за яе такіх дзвюх дзяўчат адшыў! Каб не яна, ужо даўно ажаніўся б...»

*Раней я думаў, што беларускае інтэрнэт-радыё вяшчае ў нябёсы, што тэхналогіі пакуль не развіліся да такой ступені, каб можна было казаць пра нейкую папулярнасць. Але візіт на працу да дыджэя Рудзені мяне здзівіў. За гадзіну эфіру падчас яго шоу ў студыю патэлефанавала шэсць чалавек, прыйшло некалькі дзясяткаў заявак праз інтэрнэт.*

— Так, Юля, ставім дзве песні запар, і я на перакур, — *загадаў Паша Рудзеня сваёй напарніцы і пашураваў на ганак.* — Я які ў жыцці, такі і на радыё. Абсалютна просты, пазітыўны і завадны. Валам паведамленні, і нават тэлефанаванні раскачагарылі. Учора нам прыйшло каля 500 заявак на песні. Давялося праграму працягваць на некалькі гадзін. Але наша інтэрнэт-радыё — гэта некамерцыйны праект, грошы не зарабляюцца. Аднак я перакананы: будучыня радыё — за інтэрнэтам. А вось FM-радыёстанцыі, думаю, страцілі шмат слухачоў.

*Пасля эфіру, падвозячы дыджэя Пашу Рудзеню дахаты, пытаюся ў яго пра асабістае жыццё.*

**— У цябе дзяўчына ёсць?**

— З кім час правесці ёсць. Раней былі сур'ёзныя адносіны, але мы разышліся, так атрымалася. Дзіцяці ўжо чатыры гады.

**— ??? Пра гэта можна пісаць?**

— Можна. Справа не ў тым, што ў мяне няма зроку. Справа ў яе маці. З кім бы дзяўчына ні сустракалася, мама заўсёды была супраць. Сустракацца можна было толькі тады, калі маці была на працы. Потым пачалося: то давай развітаемся, то давай усё вернем, то давай развітаемся, то давай сыдземся. Я з-за яе дзвюх такіх дзяўчат адшыў! Адна да мяне так ляпілася! Гатовы быў ажаніцца.

Потым мая задзяжарала, паабяцала, што не будзе слухацца маці. Ну а калі нарадзіла, сказала: «Мама не хоча, каб я з табой сустракалася». Тая маці такая недалёкая, што прымусіла дзіцяці імя па бацьку змяніць.

**— А што ты цэніш у жанчынах?**

— Дабрыню, шчырасць. Каб паміж паловамі было ўзаемаразуменне, павага. Каб сцервай не была.

**— А сцерваў шмат табе траплялася?**

— Ды не ведаю. Камунікую з усімі, якія добрыя. Але ў асноўным з дзяўчатамі зараз сябрую. А тыя, што сёння хочуць са мной сустракацца (такіх, дарэчы, некалькі) — ну не маё гэта...

**P.S.** *Што мяне моцна здзівіла, ніводная вядомая камерцыйная радыёстанцыя, ніводзін тэлеканал дагэтуль не запрасілі шоумэна і дыджэя Рудзеню на працу. Па спецыяльнасці гэты хлопец не зарабляе ні рубля.*

*Праўда, яго гэта акалічнасць турбуе менш, чым вас і мяне.*

**Яўген ВАЛОШЫН.**
**Фота аўтара.**

---

Шануй сваё

# «Мумій Троль» і «Воплі Відаплясава» заспявалі па-беларуску. Чаму?

**МУЗЫКІ з Украіны, Расіі, Бельгіі, Швецыі, Германіі, Нарвегіі і іншых краін запісалі свае самыя вядомыя песні па-беларуску ў альбоме «Будзьма! Тузін. Перазагрузка-2». Альбом складаецца з 12 кампазіцый. Адразу пасля з'яўлення ў сеціве песні пачалі гучаць у эфіры радыё «Сталіца» ў праграме «Ну і дзянёк!».**

Поўны спіс выканаўцаў пакуль трымаецца ў сакрэце — дзеля захавання інтрыгі. Але прэзентацыі беларускамоўных песень вядомых гуртоў «Мумій Троль» (Расія), «Воплі Відаплясава» (Украіна), «Dreamgale» (Швецыя) і бельгійскага шоумена з беларускімі каранямі Алега Мінакова (Джагера) ўжо адбыліся. Алег Скрыпка («ВВ»), напрыклад, праспяваў па-беларуску сваю вядомую «Краіну мрой» — песню з 25-гадовай гісторыяй. А Алег Джагер — «Дзень без чараў тваіх», беларускую версію свайго чароўнага хіта «Day Without Your Love», напісанага ў апошні дзень існавання Савецкага Саюза. Яна з'явілася за часам гурта «Инспектор», увайшла ў рэпертуар «Rouble Zone», а цяпер Алег выконвае яе сольна на сваіх канцэртах па ўсёй Еўропе. На беларускі лад яе пераасэнсаваў Сяргей Балахонаў. Цікава, што кожны з артыстаў сам вызначаў, якую песню праспяваць на мове беларусаў, а вось перастварыць тэкст па-беларуску ім дапамагалі нашы пісьменнікі.

— Толькі родная мова, родная культура дазваляе захаваць сябе, зрабіць больш багатай сваю творчасць, надаць ёй сэнс, — перакананы Алег Скрыпка, які вось ужо некалькі гадоў актыўна запрашае беларускіх выканаўцаў на ўкраінскі этна-фестываль «Краіна мрій». — Недастаткова проста пісаць добрую музыку альбо нешта яшчэ — важны змест таго, чым ты займаешся. Несці сваю мову ў цэлы свет — гэта высокая місія, вартая найлепшых.

Праект «Будзьма! Тузін. Перазагрузка-2» з'яўляецца працягам першага альбома, для якога спявалі выключна беларускія выканаўцы. Увогуле, праект створаны для падтрымкі беларускай культуры і мовы. А тое, што па-беларуску заспявалі нават замежныя славутасці, сапраўды ўздымае прэстыж беларускай мовы сярод скептыкаў і з'яўляецца добрым распаўсюджаннем адметнага беларускага слова сярод айчыннай моладзі і за межы нашай краіны.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

### КРАІНА МРОЙ

**(муз. і сл. А. Скрыпка, бел. тэкст — А. Хадановіч).**

*Чуў я — ці мне сніцца парой,*
*Што існуе краіна мрой,*
*У той краіне расце дзівосны гай.*
*Гай той кожны можа знайсці —*
*Таямніцу чароўнасці,*
*Дасягнуўшы глыбіняў, разгадай!*
*Хай нясе мяне рака*
*Ў зачараваным чаўне,*
*Ў неба нясе,*
*Быццам ува сне.*
*Там шмат патаемных хадоў,*
*Што сягаюць былых гадоў,*
*Там жывёлы нябеснай дабрыні.*
*Не шукай ты на мапах яе,*
*Яна там, дзе шляхі твае*
*Да бясконцай імкнуць далечыні.*
*Нас нясе, нясе рака*
*Ў зачараваным чаўне,*
*Ў неба нясе,*
*Быццам ува сне.*

---

**СЛУЦКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит 21 октября 2011 года в 10 часов в зале заседаний исполкома (3-й этаж, каб. 306), расположенном по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 189, ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ (далее лот № 1, лот № 2, лот № 3):**

Лот № 1. Земельный участок (кадастровый номер 624650100001007751) площадью 0,1861 га по адресу: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 2. Целевое назначение: строительство детского кафе.

Лот № 2. Земельный участок (кадастровый номер 624650100001007752) площадью 0,0678 га по адресу: г. Слуцк, ул. Левоняна, д. 31А. Целевое назначение: установка павильона бытового обслуживания населения.

Лот № 3. Земельный участок (кадастровый номер 624650100001007753) площадью 0,1419 га по адресу: г. Слуцк, ул. Виленская, У-1. Целевое назначение: строительство молодежно-развлекательного центра (кафе, бильярдный клуб, тир).

Начальная цена на право заключения договора аренды лота № 1 – 47 826 200 рубля, лота № 2 – 25 668 620 рублей, лота № 3 – 35 089 400 рубля.

Участники аукциона должны представить следующие документы:
- заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица РБ – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно – финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Залог в размере 4 782 620 белорусских рублей по лоту № 1, 2 566 860 белорусских рублей по лоту № 2, 3 509 000 белорусских рублей по лоту № 3 перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет райфо № 3602626000010 в филиале № 615 АСБ «Беларусбанк», код 808, УНН 601057783, код платежа 4002.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 189, 5-й этаж, отдел экономики, каб. 523 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 21 сентября по 18 октября 2011 г. включительно.**

**Заключительная регистрация: с 9.30 до 9.55 в день аукциона по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 189, зал заседаний исполкома (3-й этаж, каб. 306).**

Аукцион состоится по лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельным участком, который предлагается для продажи по результатам аукциона, путем выезда на местонахождение данного земельного участка.

Дополнительную информацию можно получить в отделе экономики райисполкома: г. Слуцк, ул. Ленина, 189, каб. 523.

**Контактные телефоны: 52389, 61201, 24444.**

---

### УРАДЗІЛА КАРАЛЕВА ПАЛЁЎ

**Сярэдняя ўраджайнасць кукурузы на Гомельшчыне сёлета складае больш за 253 цэнтнеры з гектара. Гэта на 65 цэнтнераў вышэй за леташнюю. А ў Рэчыцкім і Добрушскім раёнах яна перавышае 300 цэнтнераў.**

У корманарыхтоўшчыкаў поўным ходам ідзе ўборка галоўнай кармавой культуры, паведамілі ў Гомельскім абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні. Ва ўсіх раёнах вобласці ўбіраюць «каралеву палёў» на сілас, а ў гаспадарках 15 раёнаў прыступілі і да малацьбы катахоў на збожжа. У параўнанні з мінулым годам плошчы пад маіс былі павялічаны са 130 да 210 тысяч гектараў. Яшчэ на 37,3 тысячы гектараў трэба ўбраць кукурузу на зерне. Самы вялікі аб'ём работ трэба выканаць корманарыхтоўшчыкам Буда-Кашалёўскага, Гомельскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Рэчыцкага і Рагачоўскага раёнаў. У кожным з іх культура займае ад 16 да 20 тысяч гектараў. У кармавыя траншэі плануецца закласці амаль 4,5 мільёна тон кукурузнага сіласу. Такім чынам жывёлагадоўля Гомельшчыны будзе з надзейным запасам кармоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### НЕ ГОРШ ЗА ІМПАРТНАЕ

**Гродзенскае прадпрыемства «Тайфун» павялічвае аб'ёмы і асартымент будаўнічых сумесяў, што дазволіць спажыўцам гэтай прадукцыі менш залежаць ад імпарту.**

Уведзена ў эксплуатацыю новая вытворчасць па вырабе цэлага спектра аддзелачных матэрыялаў — розных відаў тынкоўкі, клею, дэкаратыўных фарбаў для ўнутраных і фасадных работ, што выкарыстоўваюцца пры будаўніцтве і рамонце.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ПІВА З «ЖЫВЫМ» СМАКАМ

**Першая партыя «жывога» піва ад ААТ «Лідскае піва» сегмента «Прэміум» паступіла ў бары, кавярні і рэстараны краіны.**

Як вядома, перад разлівам пеннага напою ва ўпаковачную тару піввары выдаляюць з яго ўсе мікраарганізмы, што вядуць да скісання, з'яўлення горычы і непрыемнага паху. Большасць вытворцаў для гэтых мэтаў выкарыстоўваюць шырока распаўсюджаны спосаб пастэрызацыі, калі піва тэрмічна апрацоўваецца. А вось ААТ «Лідскае піва» нядаўна ўвяло ў эксплуатацыю ўнікальнае абсталяванне па новай як для Беларусі, так і краін СНД і Усходняй Еўропы тэхналогіі стэрыльнай фільтрацыі. Сакрэт новай тэхналогіі — у інавацыйнай канструкцыі абсталявання, якое ўяўляе сабой сістэму мембранных і модульных фільтраў, што забяспечваюць асабліва «тонкую» фільтрацыю без уздзеяння тэмпературы, паведамілі на прадпрыемстве. У выніку захоўваюцца «жывыя» ўласцівасці піва. Як сведчаць даследаванні, новая тэхналогія забяспечвае больш стабільны і натуральны смак, уласцівы прадукту высокай якасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

**Філіял «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
❖ Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| № лота | Наименование объекта / Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Машина фасовочная (полуавтомат) для фасовки тонкодисперсных материалов ФАП-20 ТД2 М | 22 402 000 | 2 240 200 |
| 2 | Транспортер стационарный ленточный роликовый ЛТС-01 СБ.500 | 9 526 000 | 952 600 |

**Продавец имущества:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при администрации Новобелицкого района, адрес объекта: **г. Гомель, ул. Барыкина, 309б.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 13 октября 2011 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **14 октября 2011 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: 8 0232 75 06 63 (факс), www.bti.by**

---

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 3 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, чайнік, параварку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **5 кастрычніка 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 15 кастрычніка 2011 г.**

Дастаўку параварак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 30.08.11 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 30.08.11 па 31.12.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1915 ад 18.08.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на IV кв. або 2-е паўг. 2011 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] (індэкс) ____________________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

---

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету** ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

---

26 сентября 2011 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Начало регистрации участников собрания: 14.30.

*УНП 200050191*

ИП Трунов Антон Владимирович (УНП 191481947) прекращает свою деятельность. Претензии принимаются в течение 2-х месяцев с момента публикации по тел. 8 029 871 49 05.

### ЗНЯЛА КВАТЭРУ НА СУТКІ І...

**Беспрацоўная з Пінскага раёна зняла кватэру на суткі, а затым па аб'яве ў мясцовай газеце пераздала кватэру на працяглы тэрмін дзвюм сем'ям. Пры гэтым ашуканка гаварыла, што ёй трэба тэрмінова з'ехаць.**

Першая сям'я, якая прыйшла паглядзець на кватэру, дала задатак у 700 тысяч, а другая — 400 тысяч рублёў. Калі гаспадыня прыйшла забіраць ключ, то ўбачыла першую сям'ю, якая на «законнай падставе» засялілася ў кватэру. Праз суткі прыехала і другая сям'я. 25-гадовую ашуканку затрымалі ў Пінску, але пры ёй грошай пацярпелых не было. Заведзена крымінальная справа, і ёсць падазрэнне, што затрыманая правярнула не толькі гэтую аферу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## НА ТРАІХ СЦЯМІЛІ

Тры жыхары Светлагорска ноччу прабраліся на тэрыторыю мясцовага домабудаўнічага камбіната. Шлях туды добра ведаў адзін са зламыснікаў, які працаваў на прадпрыемстве. Грамадзяне знялі з вежавага крана на тэрыторыі каля будоўлі 44 м сілавога меднага кабелю. Шкода складае Br11,5 млн.

Таксама на сваё роднае прадпрыемства накіраваўся ноччу па незаконную здабычу рабочы СВК «Светлы шлях», што ў Рагачоўскім раёне. З адрыны малочнатаварнай фермы ля вёскі Стоўпня мужчына выкраў транспарцёр, які каштуе больш за Br2 млн.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НАЧНЫЯ ВІЗІТЫ

У Віцебскі РАУС з фермерскай гаспадаркі паведамілі, што ноччу, падабраўшы ключ да свінафермы, скралі адтуль трох парсючкоў. Свінаферма не ахоўвалася. Страту адміністрацыя гаспадаркі ацаніла на суму 2,8 мільёна рублёў. Парсючкоў скраў 48-гадовы беспрацоўны сельскі жыхар.

А жыхарка вёскі Заронава таго ж раёна паскардзілася ў міліцыю на тое, што скралі тры бітоны і плуг. Усё гэта жанчына ацаніла ў 1,4 мільёна рублёў. Кражу ўчынілі два аднавяскоўцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Модны кірмаш

# Гэтай восенню пакіньце сабе КАВАЛАЧАК ЛЕТА...



**Восень ужо паспела сустрэць нас не толькі сонцам, але і праліўнымі дажджамі. Прыйшоў час схаваць на паліцах басаножкі і зручныя «в'етнамкі», мікра-шорты і доўгія сарафаны. Чым жа ў гэтым сезоне запаўняць свае шафы? Ці ёсць другі шанц у скураной курткі? Якую вопратку ствараюць беларускія дызайнеры і што іх натхняе? На ўсе гэтыя пытанні адказала Ганна ДРАГАЦЭННАЯ, у мінулым студэнтка БДАМ, а цяпер — паспяховы дызайнер.**

***— Ганна, скажы, стаць дызайнерам — мара дзяцінства? Ці, можа, бачыла сябе кім-небудзь яшчэ?***

— Абсалютна не ўяўляю сябе за нейкай іншай работай. Мне здаецца, што шыць я любіла заўсёды. Памятаю, з сястрой пастаянна перакройвалі, перараблялі маміны ўборы. Яна вельмі злавалася, а нам так падабалася даваць некаторым рэчам новае жыццё, ствараць нешта прыгожае...

***— У якіх конкурсах ты паспела праявіць сябе і дзе, акрамя Беларусі, дэманстравала свой талент?***

— З 2008 года я ўдзельнічала ў «Млыне моды». Гэты конкурс паслужыў добрым штуршком у модны свет, дзякуючы чаму са сваімі паказамі я пабывала ў Берліне, Бруселі, Празе, Вене, Вільні. Ды ўжо цяпер і не ўзгадаеш усіх тых еўрапейскіх гарадоў.

***— А беларускія вядомыя людзі з заказамі звяртаюцца?***

— Па прыгожае адзенне да мяне ідзе зусім розны народ, а таксама, што прыемна, зоркі беларускай эстрады. Напрыклад, я працавала з выканаўцамі Алёнай Ланской, Вольгай Рыжыкавай, групай «U-Life».

***— Што цябе натхняе на стварэнне ўбораў?***

— Складанае пытанне. Бо гэтае адчуванне, назавём яго так, прыходзіць нечакана, я б нават сказала, раптоўна. Гэта мімалётны парыў — ухапіўшы яго, імкнешся захаваць у сваім адзенні. На стварэнне вобразаў мяне падштурхоўваюць як людзі, так і разнастайныя прадметы.

***— На каго ж арыентавана твая вопратка?***

— Я імкнуся ствараць такія ўборы, якія маглі б спадабацца калі не ўсім, то шмат каму. Некаторае адзенне падыходзіць для паўсядзённага жыцця. Аднак мая маленькая слабасць — вячэрнія і вясельныя строі.

***— А якім тканінам аддаеш перавагу?***

— Я працую пераважна з натуральнымі тканінамі. Вельмі люблю шоўк, у асноўным выкарыстоўваю яго для вячэрніх убораў.

***— Зараз трохі аб цяперашнім сезоне. Чым павінна абавязкова абзавесціся дзяўчына, каб патрапіць у «лодку» моднікаў?***

— Па сутнасці, прынцыпова новых трэндаў у сезоне «восень-зіма 2011-2012» на паказах заўважана не было. Дызайнеры проста трохі відазмянялі старыя матывы. Адносна свежай ідэяй сталі класічная чорна-чырвоная клетка на штанах, спадніцах, паліто — словам, усюды; і чырвоны колер. Я б параіла модніцам не праходзіць міма сукенак гэтага колеру і адну абавязкова набыць у свой гардэроб. 1940-я падарылі гэтаму сезону спадніцы да калена, тонкую гарнітурную палоску і прынты ў гарошак.





***— А што з мінулых сезонаў не трэба далёка хаваць?***

— З лета пакідайце ўборы з кветкавым прынтам, прычым малюнак можа быць любы — дробны ці буйны. Смела апранайце сукенкі, блузкі з каўнерыкамі — вобраз школьніцы сёння ў модзе. Спадніцы-максі таксама не адпраўляйце на верхнюю паліцу. З мінулага сезона «восень-зіма» да нас вяртаецца футра, як натуральны, так і штучны. А скураным паліто і курткам таксама не трэба вісець на вешалках.

***— Што з трэндаў не прайшло міма твайго гардэроба?***

— Я абавязкова апрану камбінезон. Яшчэ, як і любой дзяўчыне, часам хочацца надаць больш рамантычнасці свайму вобразу, таму я не змагла прайсці міма карункаў. А як пахаладае, вы абавязкова ўбачыце на мне футра.

Нам застаецца падзякаваць Ганне за добрую гутарку, а самім хутка бегчы па маленькую чырвоную сукенку.

**Ірына РАБУШКА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.40 | 19.30 | 12.50 |
| Віцебск — | 6.28 | 19.20 | 12.52 |
| Магілёў — | 6.30 | 19.20 | 12.50 |
| Гомель — | 6.28 | 19.15 | 12.47 |
| Гродна — | 6.55 | 19.45 | 12.50 |
| Брэст — | 6.57 | 19.44 | 12.47 |

### Месяц

*Поўня 12 верасня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Марфы, Сямёна.*

*К. УЗВІЖАННЕ (Узвышэння Крыжа Святога), Альберта, Бярнарда, Рамана, Цыпрыяна.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




# Пры капрамонце мінчане будуць аплачваць замену сантэхнікі

**Мінчане з 2012 года пры капрамонце дамоў будуць аплачваць замену сантэхнікі. Аб гэтым паведаміў першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар Васільеў падчас online-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.**

Ігар Васільеў растлумачыў, што раней замена ўнітазаў, ваннаў, умывальнікаў, змешвальнікаў і водаправодных труб у дамах мінчан праводзілася за сродкі капрамонту. Для зніжэння затрат пры капітальным рамонце жыллёвага фонду і нарошчвання ў сталіцы аб'ёмаў капрамонту ўнесены змяненні ў ТКП «Тэхнічная эксплуатацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў. Парадак правядзення». Згодна са змяненнямі замена санітарна-тэхнічнага абсталявання і падводак да яго (унутрыкватэрных сістэм халоднага і гарачага водазабеспячэння, а таксама сістэмы каналізацыі пасля замены стаякоў з раструбамі ў кватэрах) з 1 студзеня 2012 года будзе праводзіцца за кошт наймальнікаў, уласнікаў жылых памяшканняў, — сказаў першы намеснік Мінгарвыканкама, адзначыўшы, што гэта мера прыведзена ў адпаведнасць з заканадаўствам (артыкул 55 Жыллёвага кодэкса).

Цяпер адлічэнні насельніцтва і арандатараў на капітальны рамонт жыллёвага фонду складаюць 31,8 працэнта ад агульнага аб'ёму фінансавання, паведаміў прадстаўнік гарвыканкама. «І калі палічыць затраты на 1 кв.м капітальнага рамонту па існуючым тарыфе, то яны будуць кампенсаваны насельніцтвам праз 106 гадоў», — заўважыў Ігар Васільеў. Так, кошт капрамонту 1 кв.м у студзені—чэрвені гэтага года складаў Br434,5 тыс., а тарыф на тэхнічнае абслугоўванне 1 кв.м агульнай плошчы жылога памяшкання ў месяц — Br340.

Творчасць

# ВЯЛІКІ КУЛЁН У КОНКУРСЕ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**ГРАМАДСКАЯ арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» працягвае конкурс дзіцячых малюнкаў, плакатаў і літаратурных твораў, прысвечаных птушцы 2011 года — вялікаму кулёну.**

Вялікі даўгадзюбы кулён выбраны птушкай года не выпадкова. **Спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан ШАЙКІН** нагадвае, што амерыканскі сваяк нашай птушкі — эскімоскі кулён — у выніку гаспадарчай дзейнасці і прамога знішчэння чалавекам увогуле назаўжды знік з нашай планеты. Трэба нагадаць, што танкадзюбы кулён з'яўляецца, бадай, самай рэдкай птушкай на Зямлі, а ўсе астатнія віды кулёнаў занесены ў Чырвоныя кнігі розных краін.

Вялікі кулён сёння занесены ў Чырвоны спіс Міжнароднага саюза аховы прыроды, бо колькасць гэтага віду ў Еўропе штогод скарачаецца.

Кіраўніцтва грамадскай арганізацыі звяртаецца да ўсіх выкладчыкаў Беларусі больш актыўна прымаць удзел у Нацыянальнай кампаніі «Птушка года». Трэба дасылаць у АПБ усе работы пра гэтую птушку, нават калі настаўніку здаецца, што дзіцячы малюнак ці іншы твор недастаткова «моцны» для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе. Спецыялісты АПБ абяцаюць, што ўсе ўдзельнікі гэтай акцыі атрымаюць памятныя сертыфікаты і іншыя матэрыялы аб птушках Беларусі.

Умовы экалагічных конкурсаў размешчаны на сайце АПБ: www.ptushki.org

Пераможцы конкурсу, акрамя прызоў і дыпломаў, атрымаюць памятныя манеты Нацыянальнага банка РБ «Вялікі кулён» з серыі «Птушка года».

**Сяргей КУРКАЧ.**






Вялікі кулён на малюнках Яўгена Шумскага і Алены Крот з Жодзіна.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Эсперанта. Феміда. Нар. Юнона. Флора. Зык. Брытва. Асот. Ігра. Праца. Ніка. Тук. Драп. Адвага. Ара. Этап. Баль. Нюх. Ікс. Ясенін. Пралік. Рана. Грот. Рака. Бакас. Азот. Саар. Халва. Льеж. Ява. Нажоўка.

**Па вертыкалі:** Ніагара. Курс. Арэс. Неба. Пат. Піта. Дэфо. Прарок. Фут. Лат. Блік. Сала. Спіноза. Нона. Каваль. Дары. Авен. Арака. Каньяк. Пража. Спад. Бор. Венера. Тата. Юнак. Цуп. Хіна. Вакал. Настурка.

## 14 верасня

Дзве даты

***У праваслаўных вернікаў — пачатак індыкту (царкоўнае навалецце).***

**1906 год** — выйшаў першы нумар першай легальнай беларускай газеты «Наша доля». Выдавалася ў Вільні да 14 снежня 1906 года, была забароненая царскімі ўладамі. Выходзіла штотыдзень, друкавалася кірыліцай і лацінкай. Выйшла 6 нумароў, 4 з іх канфіскаваныя. У праграмным артыкуле «Да чытачоў» газета выступіла за сацыяльныя і нацыянальныя свабоды, адукацыю на беларускай мове, культурнае адраджэнне краю. Друкавала вострыя публіцыстычныя артыкулы і фельетоны, у якіх выкрывала антынародную палітыку ўрада. Апублікавала творы Цёткі, Ядвігіна Ш., прасякнутыя рэвалюцыйна-вызваленчымі ідэямі. У рубрыках «Усяго патроху», «З Беларусі і Літвы», «Па Расіі» інфармавала пра падзеі ў краіне, рэвалюцыйным руху, дзейнасці дэмакратычнай фракцыі Дзяржаўнай думы. У гэты ж дзень у «Нашай долі» адбыўся літаратурны дэбют Якуба Коласа — тут быў надрукаваны ягоны верш «Наш край».



**1698 год** — Праз шэсць дзён пасля таго, як цар Пётр I уласнаручна абрэзаў бароды сваім вяльможам, адбыўся вялікі абед у баярына Аляксея Сямёнавіча Шэіна з нагоды тагачаснага Новага года. Некаторыя з нездагадлівых гасцей усё-такі з'явіліся з барадамі, але тут ужо ў абразанні барод практыкаваўся царскі блазан. Хто пасля гэтага не хацеў галіцца, павінен быў плаціць пошліну за права на бараду.

Цытата дня:

***«Можна дваццаць гадоў вагацца перад тым, як зрабіць крок, але нельга адступаць, калі ён ужо зроблены».***

**Альфрэд дэ Мюссэ (1810—1857), французскі паэт-рамантык.**

# ВАРОНА

*Воран каркае — да няшчасця, варона — да непагадзі*

**Варона (крумкач) у народных уяўленнях, з аднаго боку, цесна звязана з адмоўнай сімволікай, са светам продкаў, з іншага — сімвалізуе даўгалецце, а значыць, і мудрасць. Птушкі гэтай сям'і (крумкачы, галкі, гракі) маюць чорнае пер'е, і можа, таму менавіта ім надалі д'ябальскія рысы. Па народных перакананнях, крумкач жыве сто ці трыста гадоў, а значыць, можа мець пэўную ўладу над чалавекам, прадказваць смерць і напады ворагаў, даваць мудрыя парады. Вельмі часта ў паданнях і казках варону супрацьпастаўляюць боскай птушцы — голубу. З-за чорнага колеру пер'я крумкач стаў сімвалам цемры, якая папярэднічае свету Творцы. Паўсюдна лічылі, што душы грэшнікаў у іншы свет нясуць крумкачы, а душы праведнікаў — галубы.**

● Лічылася, што крумкачы ведаюць шлях на той свет — у пекла ці ў рай. Крумкач ляціць на мёртвае цела, але ў той жа час ведае, як ажывіць мёртвага. У народзе казалі, што крумкач «носіць» на сваіх крылах жывую і мёртвую ваду ці можа паказаць шлях да такіх крыніц.

● Нярэдка, згодна з народнай традыцыяй, смерць малявалі ў выглядзе чорнай вароны. Лічылася: калі ў акно ўляцеў крумкач — неабходна чакаць хуткую смерць; калі крумкач крумкаў над галавой падарожніка, над хатай, над дваром, лесам, могілкамі, садзіўся на дах, на трубу, біў крыламі ў акно, — усё гэта таксама прадказвала няшчасце.

● На Віцебшчыне лічылі: калі апоўдні над якой-небудзь хатай лётае крумкач, — гэта значыць, што ў хаце памірае вядзьмак і птушкі прыляцелі забраць яго «чорную» душу. Англійскі навуковец Врэн патлумачыў гэтую з'яву так: «Вароны маюць вельмі востры нюх і праз пячны комін чуюць пах, уласцівы целу паміраючага, таму пачынаюць лётаць каля вокнаў хаты, быццам над мярцвячынай».

● Умеючы «размаўляць» (г.зн. пераймаць галасы птушак і чалавека), крумкач з'яўляўся знакам вяшчунства. Паўсюдна лічылася, што крумкач, які сядзіць на даху ці плоце, паказвае на ведзьмака ці яго хату. Калі вароны збіраліся ў зграі, гэта заўсёды прадказвала бяду ці няшчасце: мор, напад ворагаў, смерць, галодны год і г.д.

● Лічылася, што няўдача спасцігне таго, чый шлях «пераляцела» варона.

● Калі на сваім падворку, каля хаты або плота гаспадары знаходзілі закапаную або падкінутую дохлую варону, лічылася, што гэта не прадказвае нічога добрага.

● Па паводзінах варон прадказвалі надвор'е:

— крумкачы ў кучу збіраюцца — да непагадзі;

— гучна крумкаюць — улетку да непагадзі, узімку — да маразоў;

— ходзіць, «разявіўшы» дзюбу, — да навальніцы.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# ПАЖАР АД КАПІРАВАЛЬНАГА АПАРАТА

**У 12.28 у Мінскае гарадское ўпраўленні МНС патэлефанавалі работнікі бухгалтэрыі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве, што па вуліцы П. Броўкі. Паведамілі пра ўзгаранне ў памяшканні архіва бухгалтэрыі на другім паверсе пяціпавярховага будынка.**

На месцы высветлілася, што ў кабінеце адбылося ўзгаранне капіравальнага апарата 1989 года выпуску. Адкрытага гарэння не было — быў дым слабай канцэнтрацыі. Спрацавала пажарная сігналізацыя. Пацярпелых не было. З памяшканняў другога паверха будынка работнікі МНС эвакуявалі 12 чалавек. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала кароткае замыканне электраправодкі капіравальнага апарата.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Местное самоуправление. Чырвоная змена. Свая справа. Купі лепшае! Тавары, паслугі, цэны. Нясцерпна Чарнобылю. Жыраندоля. Краіна здароўя.

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 14 600 рублёў на месяц<br>87 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 13 400 рублёў на месяц<br>80 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 24 800 рублёў на месяц<br>148 800 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 22 200 рублёў на месяц<br>133 200 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 13 250—13 350 рублёў на месяц<br>79 500—80 100 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 12 120—12 150 рублёў на месяц<br>72 720—72 900 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 591—22 511 рублёў на месяц<br>117 546—135 066 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 063—20 140 рублёў на месяц<br>108 378—120 840 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна



## На бальнічны ... за ўзнагароджанне

**Крымінальная справа за выкарыстанне фіктыўных дакументаў заведзена ў дачыненні 44-гадовага слесара з Ліды, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Устаноўлена, што «ліпавыя» лісткі непрацаздольнасці ён афармляў праз сваю знаёмую, якая мела выхад на ўрача мясцовага скурна-венералагічнага дыспансэра. Абедзвюма жанчынамі супрацоўнікі міліцыі зацікавіліся мінулай вясной, калі быў заведзены шэраг крымінальных спраў за пасрэдніцтва ў хабарніцтве і атрыманні хабару. Цяпер трэба адказваць па законе і тым, хто ішоў на бальнічны не па стане здароўя, а за ўзнагароджанне.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Узяў сякеру, пайшоў да суседа...

Жыхар вёскі Плотніца Столінскага раёна неяк увечары пайшоў да адзінокага суседа. Сякеру ён прыхапіў з сабой, паклаўшы ў пластыкавы пакет. Гаспадар ляжаў на ложку, калі да яго завітаў «госць». Апошні без усялякіх слоў накінуўся і стаў наносіць удары ляжачаму. Але мужчына змог засланіцца рукамі, неяк выбрацца з ложка і выбегчы на вуліцу. Зараз ён знаходзіцца ў бальніцы з пераломам патылічнай косці, множнымі сечанымі ранамі.

А 53-гадовы агрэсар так і не мог растлумачыць міліцыянерам, чаму ён напаў на суседа. Нецвярозы быў. Але ж гэта не апраўданне.

**Яна СВЕТАВА.**

Усміхнемся

**Мядзведзь, які навучыўся крычаць «Ау!», ніколі не бывае галодны.**

☺

— Купіў у вас шурупавёрт, а ён трэснуў.
— Доўга карысталіся?
— Ды адзін цвік забіў...

☺

**Толькі наш чалавек можа паспрачацца на скрыню гарэлкі, што кіне піць.**

☺

У маршрутцы, пасажыр — кіроўцу.
— Спыніце каля таго дома — ну там, у канцы.
Раптам у размову ўмешваецца жанчына:
— А мне спыніце, калі ласка, там — ну, бачыце, дзе котка.
Кіроўца:
— Вам каля задніх лап спыніць ці каля пярэдніх?

☺

**У нас у офісе вельмі круты прынтар: мяркуючы па гуках, якія ён выдае, ён сам перамолвае драўніну і вырабляе паперу.**

☺

Эканамічная ВНУ, экзамен. Голас студэнта:
— Скажыце, а вы імяніннікам зніжку не робіце?
Выкладчык:
— Вядома! Магу скінуць пару балаў!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 4432. Нумар падпісаны ў 19.30 13 верасня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12